№ 83 (1896)

Серада, 12 мая 2004 г.

Выдаецца з ліпеня 1995 г. на беларускай і рускай мовах

Перыядычнасць — 5 разоў у тыдзень

Выдавец: УП «Народная воля».

Кошт свабодны.

На прастор, на шырокі разлог
Выходзі, мой народ, грамадою...

Якуб КОЛАС

Народная Воля

E-mail: nv@promedia.by
http://nv.promedia.by

Надвор'е

У Мінску сёння ўдзень чакаецца — +9...+11, уначы — +1...+3; у Брэсце ўдзень — +10...+12, уначы — +4...+6; у Гродне ўдзень — +10...+12, уначы — +3...+5; у Віцебску ўдзень — +5...+7, уначы — +0...+2, без ападкаў; у Гомелі ўдзень — +12...+14, уначы — +6...+8, без ападкаў; у Магілёве ўдзень — +9...+11, уначы — +2...+4.

www.meteo.by

ПУЛЬС

Быкаў скардзіцца на Калачова

Старшыня Савета Свабоднага прафсаюза Беларускага Генадзь Быкаў накіраваў у дэпартамент дзяржаўнай інспекцыі працы Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь па Віцебскай вобласці скаргу на неабгрунтаваную аднабаковую адмову ад вядзення калектыўных перамоў дырэктарам Наваполацкай ЦЭЦ Уладзімірам Калачовым.

9 красавіка гэтага года СПБ накіраваў У.Калачову пісьмовую прапанову аб пачатку калектыўных перамоў ад імя членаў Свабоднага прафсаюза прадпрыемства. Аднак у адказ на гэты ліст дырэктар Наваполацкай ЦЭЦ адказаў, што "не мае паўнамоцтваў на вядзенне калектыўных перамоў па заключэнні калектыўнага дагавора са Свабодным прафсаюзам Беларускім".

Як лічыць лідэр СПБ, наймальнік парушыў у гэтым выпадку артыкул 357 Працоўнага кодэкса. У ім гаворыцца, што "кожны бок калектыўных працоўных адносін мае права накіраваць другому боку пісьмовае патрабаванне аб правядзенні калектыўных перамоў [...], якія другі бок абавязаны пачаць у сямідзённы тэрмін". Але дырэктар Наваполацкай ЦЭЦ у прадугледжаныя законам сем дзён калектыўныя перамовы з прадстаўнікамі СПБ не пачаў. Як зазначана ў скарзе, падпісанай Генадзем Быкавым, Свабодны прафсаюз лічыць, што "дзеяннямі дырэктара парушана наша права на вядзенне калектыўных перамоў, вызначанае артыкулам 356 Працоўнага кодэкса Рэспублікі Беларусь".

У адпаведнасці з гэтым СПБ просіць абавязаць наймальніка ў кароткія тэрміны прыступіць да калектыўных перамоў з прадстаўнікамі Свабоднага прафсаюза Беларускага, а таксама "ў сувязі з дапушчанымі грубымі парушэннямі дзеючага заканадаўства" прыцягнуць дырэктара Наваполацкай ЦЭЦ Уладзіміра Калачова да адказнасці за аднабаковую адмову ад вядзення калектыўных перамоў.

Андрэй АЛЯКСАНДРАЎ.

Вяртаецца копія Турынскай плашчаніцы

16 мая ў 9 гадзін раніцы з Украіны ў Мінск вяртаецца копія святой Турынскай плашчаніцы. З нагоды вяртання гэтай духоўнай рэліквіі ў 11 гадзін у Чырвоным касцёле святых Сымона і Алены адбудзецца ўрачыстая святая імша.

Копія Турынскай плашчаніцы заняла месца ў галоўным алтары Чырвонага касцёла 5 мая 2002 года. З 28 верасня таго ж года яна знаходзілася ва Украіне па просьбе грэка-католікаў гэтай краіны. Рэліквія з'яўляецца адной з шасці, што існуюць у свеце, поўнамаштабных копій Турынскай плашчаніцы памерам 4,36 на 1,1 метра, у якую было загарнута цела Ісуса Хрыста пасля пакарання смерцю.

Марат ГАРАВЫ.

Пакарылі шостую вяршыню свету

Беларускія альпіністы пакарылі шосты па вышыні "васьмітысячнік" планеты — гімалайскую вяршыню Чо-Айю. Яе вышыня складае 8 тысяч 201 метр над узроўнем мора.

Нагадаем, што гэтая першая беларуская экспедыцыя на Чо-Айю была прысвечана 60-годдзю вызвалення Беларусі і Мінска ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Альпіністы планавалі здзейсніць узыходжанне ў першай дэкадзе мая і справіліся з гэтай задачай, яны ўстанавілі на вяршыні сцягі Рэспублікі Беларусь і Мінска. На радзіму альпіністы вернуцца прыкладна праз тыдзень.

У гімалайскай экспедыцыі бралі ўдзел члены зборнай Беларусі па альпінізме Уладзімір Цяльпук, Міхаіл Мельнікаў, Анатоль і Віктар Лутавы.

Андрэй АЛЕКСАНДРОВІЧ.

Аляксандр Лукашэнка запрошаны на лыжаролерны крос

16 мая, у Дзень работнікаў фізічнай культуры і спорту, у беларускай сталіцы пройдзе адкрыты Кубак Мінска па лыжаролерным кросе. Як паведаміў журналістам віцэ-прэзідэнт Нацыянальнага алімпійскага камітэта (НАК), памочнік прэзідэнта краіны па пытаннях фізічнай культуры, спорту і развіцця турызму Мікалай Ананьеў, на лыжаролерную трасу выйдуць каманды дзевяці раёнаў горада, абласцей, якія пажадаюць прыняць удзел у спаборніцтвах, міністэрстваў і ведамстваў, ветэраны і ўсе жадаючыя.

Паводле слоў М.Ананьева, у рамках мерапрыемства НАК плануе правесці выставу-прэзентацыю спартыўнага і параднага адзення, у якім беларускія алімпійцы выступяць у Афінах. На спаборніцтвы запрошаны Аляксандр Лукашэнка, паведаміў яго памочнік.

Дзмітрый УЛАСАЎ, БелаПАН.

ЧУЛІ?

ЗША заклікаюць беларускія ўлады «неадкладна вызваліць» Міхаіла Марыніча

Аб гэтым гаворыцца ў заяве намесніка кіраўніка місіі ЗША ў АБСЕ Дугласа Дэвідсана, распаўсюджанай амерыканскім пасольствам у Беларусі 10 мая

Існуе меркаванне, што гэты арышт можна было б разглядаць "не як акт праследу, а як просты факт прымянення беларускага заканадаўства", гаворыцца ў заяве амерыканскага дыпламата. "Для нас было б лягчэй прыняць такі пункт гледжання, калі б мы пастаянна назіралі дзеянне справядлівага і непрадузятага заканадаўчага працэсу ў Беларусі", — зазначыў ён. Замест гэтага, на думку Д.Дэвідсана, у гэтым выпадку "мы бачым прыклад выбіральнага падыходу да прымянення заканадаўства, накіраваны на прадстаўнікоў апазіцыі, незалежныя СМІ, няўрадавыя арганізацыі, якія імкнуцца рэалізаваць свае правы на свабоду слова, сходу".

Акрамя таго, ЗША ў чарговы раз пацвярджаюць сваю "занепакоенасць з-за праследу Беларускага Хельсінкскага камітэта, а таксама старшыні Аб'яднанай грамадзянскай партыі Анатоля Лябедзькі".

Д.Дэвідсан нагадаў, што нядаўна Камісія па правах чалавека ААН і Парламенцкая асамблея Савета Еўропы прынялі дакументы, што датычацца пагаршэння сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі. Ён зазначыў, што ЗША поўнасцю згодныя з высновамі, зробленымі гэтымі арганізацыямі.

"Нягледзячы на нашы шматразовыя і настойлівыя заклікі і просьбы, нападкі на беларускае грамадства працягваюцца", — гаворыцца ў заяве амерыканскага дыпламата. У гэтай сувязі ЗША яшчэ раз заклікаюць беларускі ўрад "спыніць атаку на грамадзянскую супольнасць, незалежныя СМІ і палітычную апазіцыю". "Толькі Беларусь мае магчымасць спыніць самаізаляцыю і стварыць грамадства, у якім грамадзяне змогуць карыстацца сваімі правамі без страху", — падкрэсліў Д.Дэвідсан.

Вольга ЛАПІКАВА.

ЖАХ!

Свастыка на помніку Караткевічу

За апошні месяц гэта другі выпадак, калі фашысцкай сімволікай апаганьваюцца памятныя месцы, звязаныя з імёнамі вядомых беларускіх дзеячаў. У пэўных колах гэтыя здарэнні называюць невыпадковымі.

Як вядома, у красавіку ў вёсцы Глуша Бабруйскага раёна вандалы апаганілі свастыкай хату Алеся Адамовіча, у якой прайшло дзяцінства вядомага пісьменніка.

Пляменніца Адамовіча Галіна расказвала, што свастыку вандалы малявалі паўсюль: на падлозе, на сценах, на табурэтах. Скралі толькі тэлевізар і старэнькі акардэон, злачынцаў нават не прывабіў спартыўны ровар.

Праз некалькі дзён міліцыя затрымала падлеткаў, якія рабавалі лецішчы ў Глушы. Узбудзілі крымінальную справу, распачалі расследаванне.

Аляксандр Ваўчок, выконваючы абавязкі начальніка міліцыі Бабруйскага раёна, кажа, што суд яшчэ не адбыўся, падлеткам інкрымінуецца крадзеж уласнай маёмасці. На пытанне ***"Ці апаганьвалі свастыкай падлеткі іншыя дамы, якія рабавалі?"*** Ваўчок адказаў: *"Я ведаю, да чаго вы падводзіце. Не шукайце ў гэтым учынку палітыкі. Падлеткі падчас допыту казалі, што малявалі свастыку са свавольства"*. Аднак, як высветлілася, "сваволілі" непаўналетнія юнакі толькі ў доме Алеся Адамовіча...

У панядзелак зранку ў Кастрычніцкі раённы аддзел міліцыі Віцебска тэлефанавалі жыхары і абураліся, што на помніку Уладзіміру Караткевічу, што стаіць у скверы каля плошчы Леніна, з'явілася выява свастыкі і некалькі нецэнзурных слоў, напісаных сіняй фарбай.

Супрацоўнік аддзела культуры Віцебскага гарвыканкама **Яўген Клемянцёнак**, які з'явіўся ля помніка народнаму пісьменніку Беларусі разам з міліцыянерамі, у інтэрв'ю Радыё "Свабода" сказаў: *"Я думаю, што той, хто намаляваў гэтую свастыку, нават добра не ведае, што гэты сімвал азначае. Зважаючы на змест астатніх надпісаў, я думаю, што гэта — звычайнае хуліганства. Ну якая ў адносінах да Караткевіча можа быць міжнацыянальная варожасць! Хаця падобныя праблемы былі: тройчы ў нас бурылі помнік Пэну на віцебскіх могілках. Але каб сказаць, што падобныя выпадкі маюць масавы характар, дык не!"*

Кіраўнік прэс-службы гарадскога аддзела міліцыі Віцебска **Анатоль Ціхан**, з якім удалося пагаварыць па тэлефоне, адзначыў, што за мінулыя выхадныя ў Віцебскай вобласці былі апаганены некалькі помнікаў на розных могілках. Па яго словах, акты вандалізму заўсёды здараюцца напярэдадні Дня Перамогі і іншых свят. Аднак ні на адной з разбураных магіл на Віцебшчыне свавольнікі не пакінулі свастыкі. Выключэнне — помнік Уладзіміру Караткевічу.

Крымінальная справа па факце апаганьвання помніка Караткевічу ў Віцебску пакуль не ўзбуджана. Анатоль Ціхан кажа, што зараз вядзецца адмысловая работа, следчыя правяраюць, ці мае дачыненне да здарэння РНА ці іншыя скінхедаўскія арганізацыі.

Я патэлефанавала самаму блізкаму сябру Уладзіміра Караткевіча, народнаму паэту Беларусі **Рыгору Барадуліну**. Гэты стары, мудры чалавек, які шмат чаго бачыў у жыцці, ледзь мог гаварыць ад узрушэння і абурэння. Апаганьванне месцаў, звязаных са слыннымі сынамі Беларусі, ён не лічыць выпадковымі здарэннямі.

— У Глушы апаганілі памяць і хату Алеся Адамовіча, які будзіў сумленне, будзіў беларускую душу, — кажа Рыгор Іванавіч. — *Цяпер апаганілі помнік Уладзіміру Караткевічу, які верыў у неўміручасць беларускай душы, быў светлым анёлам нацыі.*

Тут не хуліганства з п'яных вачэй, не юнацкая ўседазволенасць. Пэўным колам грамадства не даспадобы, што Беларусь прачынаецца, што беларусы хочуць быць беларусамі, гаспадарамі ў сваёй хаце. Апаганьваецца памяць тых, хто быў супраць фашызму, супраць нацызму. Невядомыя-вядомыя, крэслячы свастыку, самі трымаюцца фашысцкага накірунку, мроячы яго рэаніміраваць на зямлі, палітай крывёй змаганцаў супраць фашызму.

Цікава, чаму гэта не цікавіць КДБ, рускую абрэвіятуру якога я расшыфроўваю як "кантора глыбокага бурэння"? Тут трэба ўзгадаць словы Юліуса Фучыка: "Людзі, будзьце пільнымі, я люблю вас".

Марыя ЭЙСМАНТ.

АСАБІСТЫ ПОГЛЯД

Свята ў розных люстэрках

У савецкі час Дзень Перамогі быў адзіным святам, якое мела афіцыйна-дзяржаўны статус і адначасова з'ўлялася сапраўды народным. Усе астатнія былі проста законнай падставай не хадзіць на работу.

Сапраўды, якой нагодай для радасці магла быць чарговая гадавіна бальшавіцкага путча? Як і дзень арміі, службу ў якой прагматычная моладзь лічыла страчаным часам і актыўна "касіла" ад яе, асабліва з пачаткам Афганскай вайны. Жаночы дзень чамусьці прышчэплены забытай сёння Розай Люксембург да восьмага дня сакавіка. Дзень Канстытуцыі не ўспрымаўся належным чынам з-за таго, што яна існавала толькі на паперы, а ў рэальным жыцці яе падмяняла "тэлефоннае права".



Свята Перамогі народ у літаральным сэнсе заваяваў крывёю. А паколькі дзень 9 мая ў народнай свядомасці пасунуў убок і 1 мая, і 7 лістапада, то ўлада гэтае свята доўгі час недалюблівала. Нездарма шырока і пампезна адзначаць 9 мая пачалі толькі ў 1965 годзе, калі нарадзілася новае пакаленне, якому замест вядомай ветэранам страшнай праўды можна было адносна лёгка ўперці адрэдагаваную, адлакіраваную версію ваенных падзей; калі ўжо крыху падзабылася, што кашмарам 1941 года і велізарнымі стратамі на працягу ўсёй вайны краіна абавязана злачыннай нядзатнасці ўлады, а трыумфам 1945-га — выключна гераізму народа, які ў гэтай вайне фактычна меў двух ворагаў — фашыстаў на фронце і сваё начальства за спінай. Гэта ва ўскоснай форме прызнаваў нават Сталін. У 1945 годзе, паднімаючы келіх за Перамогу, ён дзякаваў народу за тое, што, маючы ў 1941 годзе ўсе падставы скінуць савецкі урад, народ тым не менш дазволіў яму кіраваць далей. Праявіў, так бы мовіць, мудрасць...

Ва ўмовах "халоднай вайны" кіраўніцтва СССР скарыстоўвала Дзень Перамогі і ўвогуле памяць пра Вялікую Айчынную, каб трымаць краіну ў напружанасці, у псіхалагічнай гатоўнасці да новай вайны. Разам з тым савецкім людзям, якія камплексавалі перад заходняй цывілізацыяй, Дзень Перамогі даваў магчымасць адчуць сваю значнасць, сваю пазітыўную ролю ў сусветнай гісторыі. Гэта таму, што разам з СССР свята адзначалі ягоныя хаўруснікі ў Еўропе і "браты па класе" ў астатнім свеце. Сёння былыя савецкія сатэліты альбо ўступілі ў "Злучаныя Штаты Еўропы" альбо стаяць ў чарзе на ўступленне, а "браты па класе" перайшлі ў іншы клас, дзе замест марксізму вывучаюць асновы дэмакратыі і рынкавай гаспадаркі.

Сённяшняя Еўропа шануе памяць ахвяр фашызму і герояў Рэзістансу, але трактуе Другую сусветную як *"апошнюю грамадзянскую вайну еўрапейскіх народаў"*. Такі погляд дазваляе памірыць пераможцаў і пераможаных, не зацыкліваецца на пытаннях, хто першы пачаў, хто каму болей гора прынёс і, адпаведна, — хто каму больш вінны. Калі не развярэджваць старыя раны, прасцей падвесці рысу пад мінулым і далей разам будаваць агульны еўрапейскі дом.

Свой "Дзень Перамогі" нашы заходнія суседзі, сярод якіх і памежныя з намі краіны Балтыйскага рэгіёна, адзначылі 1 мая, калі сталі паўнапраўнымі чальцамі Еўрапейскага Саюза. Дзень пашырэння "Злучаных Штатаў Еўропы" — гэта Дзень Перамогі над зданямі мінулага, над ідэалагічнымі забабонамі, над "франтавым сіндромам", які ў большай ці меншай ступені ўласцівы ўсёй посткамуністычнай прасторы.

Нас на гэтым свяце не было. Паміж суседскім святам і нашым — разбежка ў восем дзён. А калі лічыць ад 1994 года, калі Беларусь збілася з еўрапейскага шляху, дык і ўсе дзесяць год. Іхняе свята звернута ў будучыню, наша — трымае краіну ў мінулым.

Той, хто глядзеў 9 мая Беларускае тэлебачанне, нібыта трапляў у Савецкі Саюз у самы разгар "застою". Усё, як калісьці, толькі яшчэ горш, бо копія заўжды горш за арыгінал. Усё тая ж заштампаванасць афіцыйных прамоў, "дабраахвотна-прымусовы" ўдзел наваспечаных піянераў-камсамольцаў у святочных мерапрыемствах, рытуальнае *"Спасибо нашему президенту за мирную жизнь, за заботу о нас, ветеранах"*, міралюбная рыторыка ў спалучэнні з бразгаценнем зброяй; вылучэнне ветэранаў як асабліва каштоўнай часткі грамадства ў нейкую касту і супрацьстаўленне іх моладзі, якая хоча жыць інакш. Усё гэта пад сцягамі, якія натуральна глядзеліся б у музейнай экспазіцыі, а ў палітычнай рэчаіснасці выклікаюць думкі пра сапсаваную машыну часу. Тое, што мы бачылі на экране, вельмі нагадвала сходку "правільнага" электарату падчас выбарчай кампаніі. Палітычны фарс на сюжэт ваеннай драмы.

На свята прынята запрашаць гасцей. Хто прыедзе на такое? Хіба што "браты па розуме" з Паўночнай Карэі, але ніяк не суседзі з Еўрапейскага Саюза.

Адным словам, у нас сваё люстэрка. І ў яго глядзімся толькі мы самі. Не бачым другіх, і нас ніхто не бачыць.

Пётра ВАСІЛЕЎСКІ.

Нечаканы вобыск

Былога партыйнага лідэра могуць пасадзіць на пяць гадоў «за пячатку»

Учора былога члена Вышэйшага савета Ліберальна-дэмакратычнай партыі Алега Маркевіча выклікаў на допыт следчы аддзела дазнання гарадскога ўпраўлення ўнутраных спраў А.Б.Луцэвіч. Не думаў не чакаў былы паплечнік "партайгеносе" С.Гайдукевіча, што допыт у міліцыі скончыцца абвяшчэннем таго, што супраць яго, Маркевіча, узбуджана крымінальная справа па артыкуле 377 частка 1 — "наўмыснае ўтрыманне дакументаў".

"Телегу" на гэты конт у Генеральную пракуратуру, аказваецца, напісаў на Маркевіча сам Сяргей Васільевіч Гайдукевіч, які абвінавачвае свайго былога намесніка ў *"утрыманні пячатак двюох абласных арганізацый ЛДП — Гродзенскай і Гомельскай"*.

Пасля допыту ў гарадской міліцыі Маркевіч разам з міліцыянтамі і байцамі АМАПу (добраахвотна, без прымянення сілы) накіраваліся дамоў да Алега Валянцінавіча з мэтай знайсці тыя самыя пячаткі. Але ніякіх пячатак альбо дакументаў у Маркевіча не знайшлі, аб чым быў складзены адпаведны пратакол, падпісаны міліцыянтамі і панятымі.

Алега Маркевіча такая пільная ўвага міліцыянтаў зусім не здзіўляе. *"Відавочна, пачалася "зачыстка" апазіцыйнага палітычнага поля перад маючымі адбыцца восеньню парламенцкімі выбарамі,* — мяркуе А.Маркевіч. — *Калі ўзгадаць нядаўнюю гісторыю, то "развод" у БНФ і сацыял-дэмакратаў такую пільную ўвагу ў нашых праваахоўных органаў не выклікаў".*

Калі будзе даказана віна Алега Маркевіча, то па вышэйназванай крымінальнай справе яму "свеціць" да пяці гадоў пазбаўлення волі.

Алена ДАШКЕВІЧ.

РИГА — МИНСК

Владимир Нистюк выступил по латвийскому радио

Вчера утром, включив свои радиоприемники, граждане Латвии услышали голос депутата Верховного Совета Беларуси 13-го созыва, зампреда БСДП (НГ) Владимира НИСТЮКА. Владимир Петрович в интервью латвийским журналистам оценивал политическую ситуацию в Беларуси. И оценил. На "двойку с минусом"...

"После десяти лет правления Лукашенко народ стал пробуждаться от гипноза, так как надежды, возлагаемые все это время на лидера Беларуси, не оправдались, — вещал латышским радиослушателям В.Нистюк. — *О свободе слова в Беларуси вообще говорить не приходится: если раньше в политической практике не было такого понятия, как очернительство президента или государственного чиновника, то сейчас в Уголовном кодексе есть статья, предусматривающая уголовную ответственность за "паклён на прэзідэнта"*.

Не обошел белорусский соцдемократ и болезненную для наших властей тему внебюджетных фондов: *"У него* (Лукашенко. — **А.С.**) *есть свой собственный бюджет, из которого он щедро латает как экономические, так и социальные дыры. Например, на Минском тракторном заводе сейчас стоят нереализованными примерно полторы тысячи тракторов — за них выплачены зарплата и налоги, но деньги не вернулись на предприятие. Лукашенко нашел выход: он дает распоряжение своему банку — у нас есть "Беларусбанк", находящийся под крышей государства. Банк дает кредит под зарплаты, в свою очередь Лукашенко компенсирует банковские расходы за счет своего бюджета. У него есть свой президентский фонд, в который вливаются грандиозные средства, имеется счет, о котором официально не принято говорить".* В.Нистюк привел наглядные примеры: *"В Перу были проданы самолеты за 400 миллионов долларов, но деньги не поступили ни в бюджет, ни на счета банка, и где они, никто не знает. Или продали танки Болгарии, а деньги пропали..."*

"Лукашенко понимает, — сообщает латышам опальный депутат, — *что у него нет больше политического будущего, так как Россия напирает на экономическую сторону сотрудничества, а здесь в выигрыше обычно сильнейший. В свою очередь Лукашенко также понимает, что, расставшись с экономическими рычагами, утратив личный контроль за потоками грузов, капиталов, незаконной иммиграцией рабочей силы, потоками наркотиков, он потеряет влияние и не будет нужен ни России, ни Беларуси..."*



Любопытно, а смог бы сказать нечто подобное наш политик в эфире Белорусского радио? *"Это из области фантастики,* — иронизирует в интервью "Народной воле" только что вернувшийся из Риги Владимир Нистюк. — *Мечтать о том, чтобы ко мне обратился за комментариями журналист Белорусского радио, — это Станислав Лем по-белорусски. Даже когда Белорусское телевидение и предоставляет нашим оппозиционерам возможность выступить, то наши интервью потом подвергаются тщательному "обрезанию". Из 15 минут разговора с журналистом в эфир передаются только жалкие "обрезки", и те в контексте комментариев самого журналиста. В Латвии таких реалий уже давно нет".*

А что Вы думали, Владимир Петрович? Здесь Вам не там. Это в Латвии говорят, что хотят. А в Беларуси не каждый осмелится даже пересказать Ваше выступление по латвийскому радио.

Александр СИЛИЧ.

ЗДАРЭННІ

Два ўдары маланкі

38 цялят загінулі ў выніку пажару, што ўзнік пасля падання маланкі ў цялятнік ЗАТ "Палыкавіцкае" вёскі Чарнаручча Шклоўскага раёна Магілёўскай вобласці.

Як паведамілі БелаПАН у прэс-службе Міністэрства па надзвычайных сітуацыях, у будынак цялятніка трапілі два разрады маланкі. У выніку першага пападання ў трансфарматарны шчыт, на ферме знікла святло. Калі энергазабеспячэнне было адноўлена, у дах цаглянага будынка цялятніка трапіў другі разрад, пасля чаго ўзнік пажар.

Работнікам мясцовай гаспадаркі разам з супрацоўнікамі МНС, якія прыбылі на месца здарэння, удалося выратаваць 134 цяляці. Агнём пашкоджаны дах і перакрыццё цялятніка. Ніхто з людзей не пацярпеў.

Дзмітрый БЕЛЬСКІ.

Суд апраўдаў

Усе восем удзельнікаў акцыі "Ланцуг неабыякавых людзей", што адбылася ў Наваполацку ў дзень пятых угодкаў знікнення былога міністра ўнутраных спраў Юрыя Захаранкі, апраўданы гарадскім судом. 11 мая суддзі вынеслі рашэнні, у адпаведнасці з якімі складу адміністрацыйнага правапарушэння ў дзеяннях удзельнікаў акцыі не выяўлена.

Як ужо паведамляў БелаПАН, 7 мая ў цэнтры Наваполацка, на плошчы Будаўнікоў, насупраць будынка гарвыканкама, восем чалавек выстраіліся з партрэтамі без вестак зніклых беларускіх палітыкаў. Яны былі затрыманы міліцыяй, а затым на іх былі складзены адміністрацыйныя пратаколы па артыкуле 167-1 Кодэкса аб адміністрацыйных правапарушэннях (удзел у несанкцыянаваным пікетаванні).

Андрэй АЛЯКСАНДРАЎ.

Народная Воля 12 МАЯ 2004 г.

НЕЛЬЗЯ МОЛЧАТЬ!

Михаила Маринича власть бросила за решетку. И время ответит на вопрос: за что?
Сегодня же печатается статья, написанная М.Мариничем для "Народной воли" еще на свободе.
Нельзя не заметить: мысли человека, прошедшего большую жизненную школу — от рабочего до Чрезвычайного и Полномочного посла, отличаются как глубиной, так и пониманием остроты момента.
Читайте, рассуждайте вместе с автором, делайте выводы...

Михаил МАРИНИЧ,
Чрезвычайный и Полномочный посол Республики Беларусь, экс-министр внешнеэкономических связей

Наш путь сегодня — это путь Северной Кореи

На протяжении почти десяти лет мы являемся свидетелями такой негативной тенденции, как усиление неограниченной власти одного человека — президента. Избранная модель развития общества — отнюдь не "белорусское изобретение" или необходимость в силу "белорусской специфики", а совершенно тривиальный в истории факт авторитаризма, когда один человек стремится к созданию собственной, не ограниченной ни регионами, ни временем, ни какими-либо группами населения, власти. Именно такой предстает модель белорусского общества, если отряхнуть с нее идеологические штампы и пропагандистскую шелуху.



Последние события 2004 года придают новые знаковые штрихи портрету белорусского политического правления: объявлен "крестовый поход" во имя наведения порядка, укрепления дисциплины, в том числе за счет насильственного перевода работников на контракты, продекларирована одна для всех идеология президента, продемонстрирована завершающая стадия работы над механизмом отлучения людей от частной собственности, наконец, сформулированы принципы подбора кадрового ресурса государственного управления: личная преданность президенту, абсолютная готовность выполнить любой его приказ.

Это уже проходили

Однако ни одно из направлений "новой" политики в стране не является новшеством. Ликвидация частной собственности, укрепление дисциплины, открытая война с идеологическими противниками, насаждение в обществе моноидеологии власти — это то, что еще после 1917 года стало "лекарством" для советского общества, оказавшегося в разрушенной стране с уродливыми социальными и экономическими отношениями. "Лекарство" в 30-е годы было использовано с максимальным эффектом и позволило создать иллюзию благоденствия общества, отправляя ежегодно до миллиона и более человек в так называемые исправительные (концентрационные) лагеря. Экономика же оказалась в плачевном состоянии: производство многих продуктов питания, в том числе мяса, упало в десять и более раз, резко снизились качество и эффективность труда. А главный достигнутый результат — обращение населения в массу бесправных, безликих, безвольных "винтиков" социалистической системы, утвердившейся более чем на 70 лет.

Кое-кому может показаться, что историческими аналогиями сгущаются краски. Действительно, пока мы имеем более "мягкую" ситуацию. Но она меняется, и трудно не заметить, как быстро ожесточаются правила игры. К 2004 году общество пришло с мощной карательной системой в руках государства и предельно упрощенной схемой увольнения работников за дисциплинарные, идеологические и прочие провинности. Совсем недавно в Гродненской области 70 человек не были допущены к работе за то, что не прошли курса техники безопасности. Получается, работники виноваты, что начальники не организовали занятия по технике безопасности. Подумал ли кто-нибудь о том, как будут жить семьи этих людей, не допущенных к работе?

Дисциплина и идеология — совершенно нормальные явления и требования в обществе, которые обычным образом могут существовать и вне государственного регулирования, например, на предприятии, в регионе. **Но если это становится государственным фетишем — открывается прямая дорога к диктатуре власти, как это было в СССР.** Простой и надежный прием, к которому прибегают жесткие режимы, — всегда можно сослаться на поддержку населения. При этом экономическая ситуация согласуется с "своевременностью" требований власти, предъявляемых к населению. Ведь не зря же в начале 2004 года в нашей стране объявлена "Программа продовольственной безопасности". Дает о себе знать "восстающий динозавр" — неэффективная экономика просоциалистического типа.

Отлучение от собственности

В Беларуси давно происходит последовательное отлучение людей от собственности и даже попыток ее защиты. Управление частными и акционерными предприятиями посредством "золотой акции" переходит под сень власти. Практически неограниченные возможности по "отбиранию" собственности представляет нагромождение сотен юридически не отлаженных, часто некорректных и противоречащих друг другу законодательных актов.

Под этот процесс подведена не только законодательная, но и идеологическая база. В сознание людей внедряется точка зрения, что сельскохозяйственные угодья крестьян не могут переходить по наследству, а должны после смерти пользователя перераспределяться на основе тендеров.

Шагом "прогресса" в борьбе с собственностью стало объявленное решение о конфискации автомобилей у нетрезвых водителей. В середине марта белорусский старичок-мудрец в подтяжках благовествовал с экрана о разумности и необходимости принятого решения и о том, что население, конечно, выступает в его поддержку. На самом деле дедушке никто не давал права говорить от имени всего населения и принятое решение далеко не выглядит таким уж гладким и рациональным. Особенно, если принять во внимание то, что не было гласного обсуждения закона ни среди населения, ни в парламенте, и что никто еще не определил саму категорию "нетрезвый водитель".

Предложенный вариант конфискации — простой грабеж, присваивание чужой собственности государством, которое ни копейки не вкладывало ни в покупку машины, ни в ее содержание. И потом, машину часто приобретает вся семья, зарабатывая на нее, экономя, а государство забирает ее у водителя.

В цивилизованном мире именно из-за неоднозначности и сложности этих отношений наказание нетрезвых водителей прежде всего предполагает ступенчатую систему наказания. Водителя могут оштрафовать, лишить водительских прав, но не автомобиля. Конфискация — максимальная мера и ее намеченное распространение в Беларуси есть не более чем очередное грубое объявление власти о неуважении частной собственности.

Конфискация как рычаг управления — это не помощь людям, это доказательство неограниченной власти, политического верховенства и совершенного бесправия простого человека. Впрочем, наша страна уже стала беспрецедентной по распространению конфиската. Из исключительной меры наказания он превратился в норму жизни и отрасль экономики со своим "производством" и сетью реализации. Самым ярким проявлением такого "производства" является конфискация грузов и средств их перемещения на таможенной границе Беларуси. Произвол происходит не только по отношению к белорусским, но и к российским, и к западным компаниям. Сегодня в каждом крупном или мелком городе можно увидеть магазин или отдел конфискованных товаров. Возникает вопрос: **кто зарабатывает на том, что отбирает собственность у других?**

Винтики эпохи самоутверждения президента

В последние годы в белорусском обществе последовательно, целенаправленно и настойчиво утверждается диктатура власти. Власть при этом вовсе не нацелена на рациональное и эффективное развитие экономики, а нацелена на перераспределение имеющегося, на конфискат, на утаивание государственных финансовых потоков, на формирование экономического уродца, подчиняющегося не законам, а воле одного человека и существующего по его понятиям о морали, нравственности, об экономических отношениях. Население же обложено флажками "дисциплины" и "идеологии", оно опять должно превратиться в массу винтиков, статистов новой великой стройки монархизма социалистического образца.

Методы государственной власти в Беларуси резко отличаются от действующих в цивилизованных странах:

сила закона подменяется волей президента;

уважение частной собственности — принципом конфиската;

отбор кадров на основе компетентности и профессионализма — отбором кадров на основе преданности;

делегирование полномочий по горизонтали — формированием личной президентской вертикали;

изучение зарубежного опыта — акцентом на особенности белорусской модели;

общественный контроль за расходами госуправления — отсутствием возможности общественного контроля, наличием внебюджетных президентских фондов;

независимость судов и адвокатуры — зависимостью судов, слабой адвокатурой, правовым беспределом;

контроль государственных решений через парламент и СМИ — "послушным" парламентом, давлением на независимые СМИ.

Эти отличия со временем усиливаются, относя белорусскую нацию все дальше от полюса цивилизации. Но меняются не только принципы организации государственного управления. Соответствующим образом меняется и состав высшего чиновничества. Действующей власти становятся ненужными люди, проявляющие компетентность и профессионализм. Достаточно быстро ушли с арены премьер-министр Чигирь (финансист), председатель Нацбанка Богданкевич (доктор экономических наук, финансист), министр сельского хозяйства Леонов (экономист), министр труда Соснов (экономист), министр экономики Бадей (экономист), спикер парламента Войтович (академик) и многие другие. Эти и множество других бывших управленцев до сих пор ведут напряженную интеллектуальную деятельность, остаются активными в политике, общественной жизни. Кем же замещаются вакантные места? Как правило, бесцветными скромными тружениками провинции, получающими должности по принципу преданности главе государства. Это надо же дойти до того, чтобы председателем Белтелерадиокомпании, ведомства сугубо специфического, назначить начальника отдела кадров периферийного завода? Человека, который вряд ли перечислит жанры тележурналистики, не отличит камеру от монитора. Зато свой "в доску", как же — вместе учились в институте.

Какой результат принесет целенаправленно обновляемый состав управления, легко предугадать: сверху будут идти строгие, но часто бестолковые (как это уже есть) предписания, люди на местах будут безынициативно что-то выполнять, а большую часть решений оставлять без внимания (в силу их бестолковости или невыполнимости), экономика за это время окончательно деградирует, а население еще больше обеднеет.

И все бы ничего, но в этот беспросветный период великого самоутверждения президента еще одно поколение белорусов тихо уйдет в небытие, а другое приблизится к пенсии.

Вперед — в прошлое

Совершенно очевидно, что власть в стране пришла к отрицанию экономических свобод, правового статуса человека как индивида, готова активно преследовать инакомыслие. Государство, управляемое таким образом, устремлено не в будущее, а в прошлое — к социализму и даже его ранним ступеням (сталинизму). Оно не может быть эффективно ни социально, ни экономически. В нем людям жить неуютно, проявлять инициативу — опасно, много и по-настоящему работать — невыгодно. История социализма на многочисленных примерах доказала, что такое государство все больше отстает от передового мира в экономическом и социальном развитии, постепенно превращаясь либо в нищую страну третьего мира, либо в развращенную коррупцией и разделенную непреодолимой дифференциацией между властью и населением страну латиноамериканского типа. В любом случае это страна с абсолютным большинством бедного населения. **Увы, наш путь сегодня — это не путь Австрии или Швейцарии, это путь Северной Кореи. Путь в никуда.**

ПУЛЬС

Ці трэба «бударажыць» насельніцтва?

Сёння ў Салігорску незалежны прафсаюз прадпрымальнікаў будзе "бударажыць насельніцтва". Так лічаць афіцыйныя прапагандысты. Самі ж бізнесмены правядуць мітынг у абарону сваіх правоў.

Яны хацелі сабрацца ў цэнтры горада. Ды ўлады не дазволілі, далі дабро на правядзенне мітынгу на стадыёне. Кіраўнік прафсаюза Аляксандр Цэцура спрабаваў праз мясцовае тэлебачанне даць аб'яву аб мерапрыемстве, ды там яму ў гэтым адмовілі. Маўляў, навошта бударажыць насельніцтва. Вось і атрымліваецца, што абарона сваіх правоў, крытыка улад — гэта "бударажанне насельніцтва".

Яўген ТАЎГЕНЬ.

Спынім гандаль людзьмі разам!

У Інтэрнеце з'явілася новая электронная база звестак аб спецыялізаваных установах і арганізацыях, якія працуюць у 52 краінах Еўропы і аказваюць дапамогу ахвярам гандлю людзьмі.

Такую інфармацыю можна знайсці па адрасе ў Інтэрнеце: http://bsi.db-is.net. База звестак распрацавана Беларускай асацыяцыяй сацыяльных работнікаў (БАСР) у рамках праекта ПРААН "Барацьба з гандлем жанчынамі ў Беларусі". Яна ўтрымлівае поўную інфармацыю аб правах жанчын, якія выязджаюць за мяжу, аб працаўладкаванні і заканадаўстве ў розных краінах. Па меры паступлення інфармацыі база будзе пастаянна дапаўняцца.

Паводле неафіцыйных звестак Міжнароднай арганізацыі па міграцыі ў Беларусі, штогод у Беларусі каля 10 тысяч чалавек становяцца ахвярамі гандлю людзьмі. На сёння ад злачыннай дзейнасці арганізацый, звязаных з гандлем людзьмі, пацярпелі каля 50 тысяч беларускіх грамадзян.

Вольга АСІПЕНКА.

Хочаце стаць курсантам Ваеннай акадэміі?

Курсантамі Ваеннай акадэміі ў 2004 годзе стануць больш за 500 чалавек. Мяркуецца, што на факультэт ракетных войскаў і артылерыі будуць набраны 59 чалавек, агульнавайсковы факультэт — 71, факультэт сувязі і аўтаматызаваных сістэм кіравання — 113, супрацьпаветранай абароны — 100, авіяцыйны факультэт — 40, унутраных войскаў МУС — 50, пагранічных войскаў — 80. Набору на факультэт інжынерных і аўтамабільных войскаў сёлета не будзе. На першы курс факультэта сувязі і АСК будуць залічаны 6 дзяўчат.

Як ужо паведамляў БелПАН, працэдура прыёму курсантаў для навучання ў Ваеннай акадэміі будзе мець сёлета некаторыя змяненні. Абітурыентам будзе дазволена прадастаўляць у прыёмную камісію вынікі цэнтралізаванага тэсціравання. Акрамя таго, падчас разгляду кандыдатур будучых курсантаў прыёмная камісія будзе надаваць павышаную ўвагу прафесійнаму адбору. Важную ролю будуць адыгрываць такія фактары, як псіхалагічны стан абітурыента, яго матывацыя да службы.

Вячаслаў БУДКЕВІЧ.

Рок-канцэрт у падтрымку гуманітарнага ліцэя

14 мая ў 18 гадзін у сталічным клубе "Рэактар" пачнецца рок-канцэрт у падтрымку незарэгістраванага Беларускага гуманітарнага ліцэя.

Пасля ліквідацыі ўладамі ў мінулым годзе Нацыянальнага дзяржаўнага гуманітарнага ліцэя імя Якуба Коласа гэтая навучальная ўстанова не зачынілася: навучэнцы працягваюць займацца ў сваіх выкладчыкаў. Усе спробы зарэгістраваць новую навучальную ўстанову — Беларускі гуманітарны ліцэй — былі марнымі.

Чатырохгадзінны канцэрт у падтрымку ліцэя будзе складацца з дзвюх частак. Спачатку ліцэістаў будуць вітаць рок-гурты "Zet", "Garackija", "P.L.A.N" і Аляксандр Памідораў, потым пройдуць прэзентацыі публіцыстычнага фільма аб абароне ліцэя, знятага польскімі кінадакументалістамі, і новага дыска ліцэістаў "Я люблю ліцэй: Веру ў Цябе" з серыі "Я люблю ліцэй".

Марат ГАРАВЫ.

Віцебскі «Бацька» — у Турцыі

На вуліцах турэцкага горада Трабзон заўважаны ў гэтыя дні артысты Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Якуба Коласа. Неўзабаве гасцей з Віцебска можна будзе пабачыць і ў Стамбуле.

Адзін з вядучых беларускіх сцэнічных калектываў стаў удзельнікам тэатральнага фестывалю чарнаморскіх краін, які пачаўся ў Трабзоне 10 мая.

Беларусь не належыць да чарнаморскіх дзяржаў, але для віцебскага тэатра зроблена выключэнне з дзвюх нагод: па-першае, беларусы ўжо не раз атрымлівалі высокія ўзнагароды на розных міжнародных аглядах, а, па-другое, заснавальнікаў тэатральнага форуму ў Турцыі прыцягнула тое, што коласаўцы пакажуць спектакль па п'есе класіка сусветнай драматургіі А.Стрындберга "Бацька".

Новая пастаноўка ажыццёўлена галоўным рэжысёрам тэатра Віталем Баркоўскім.

Арганізатары фестывалю, дасылаючы спецыяльнае запрашэнне коласаўцам, паведамілі, што госці могуць 12 мая прысутнічаць на паўфінальным канцэрце конкурсу Еўрабачання, дзе будуць выступаць беларускія выканаўцы Аляксандра і Канстанцін.

Сяргей БУТКЕВІЧ.

Балалайка немцам даспадобы

Даволі значную суму ў цвёрдай валюце зарабіў гастрольнымі канцэртамі актэт балалаечнікаў "Віцебскія віртуозы", які наведаў шэраг нямецкіх гарадоў.

Вытанчанаму мастацтву беларусаў апладзіравалі ў Гановеры, Вольфебютелі, Шэпенштаце, Брауншвейгу ды іншых месцах Германіі.

Гастрольны тур быў арганізаваны нямецкім дабрачынным фондам "Чарнобыльская ініцыятыва" на чале з даўнім сябрам Віцебшчыны Паулем Кохам пры садзейнічанні віцебскага таварыства інвалідаў "Клопат".

Заробленыя "Віцебскімі віртуозамі" 11 тысяч еўра будуць накіраваны на аздараўленне ў Германіі беларускіх дзяцей, пацярпелых ад чарнобыльскай ядзернай катастрофы.

Сяргей БУТКЕВІЧ.

КЛІНІКА

Беларусь наперадзе!

Па ўзроўні інфляцыі...

Згодна з апошнімі дадзенымі Статыстычнага камітэта СНД, у першым квартале 2004 года па тэмпах інфляцыі сярод краін Садружнасці ўпэўнена лідзіруе Беларусь. У нас гэты паказчык склаў 5%. На другім месцы Расія — 3,5%. Далей ідуць Азербайджан (3,1%), Малдова (3%), Арменія (2,2%), Казахстан (1,5%) і Кіргізія (1,3%). У Грузіі і Таджыкістане інфляцыя была на ўзроўні 1%. Туркменістан і Узбекістан дадзеных не далі.

Былы прэм'ер-міністр **Міхаіл ЧЫГІР** у інтэрв'ю "Народнай волі" адзінай прычынай гэтага сумнага першынства Беларусі назваў пастаяннае *"пампаванне сельскай гаспадаркі пустымі грашыма"*. *"Іншых прычын не можа быць,* — эмацыянальна сцвярджае М.Чыгір. — *Калі эканоміку "частуюць" грашыма, не забяспечанымі маёмасцю ці таварамі, класічныя эканамічныя законы не дзейнічаюць. Чым больш пустых грошай — тым вышэй цэны ў крамах. Няўжо наша цяперашняе кіраўніцтва гэтага не разумее? Тут ёсць яшчэ адзін адмоўны момант — пры высокай інфляцыі ў эканоміцы ніколі не можа быць уздыму. Нават калі статыстыка будзе сведчыць пра тое, што нібыта ўсё "о'кей"*.

Наталля ГАК.

В ПОЛЕТ!

Летние рейсы «Белавиа»

Национальная авиакомпания "Белавиа" в летний период увеличивает количество рейсов в города Европы и стран СНГ, сообщили "Интерфаксу" в авиакомпании.

"Белавиа" будет выполнять полеты в 24 города 16 стран Европы, Азии и Ближнего Востока, в том числе в 5 стран СНГ (Россию, Армению, Грузию, Украину, Казахстан) и 14 регулярных зарубежных маршрутов. При этом помимо традиционных регулярных рейсов открывается несколько новых маршрутов.

В частности, на летний период будут введены новые авиарейсы в Ганновер (с 26 июня по 11 сентября — четверг и суббота), в Павлодар (с 30 июня по 10 сентября — среда и четверг), в Симферополь (с 12 июня по 18 сентября — вторник и суббота), в Сочи (с 14 мая по 8 октября — среда и воскресенье), Усть-Каменогорск (с 25 июня по 12 сентября — пятница и суббота). Также "Белавиа" увеличивает частоту полетов на наиболее востребованных зарубежных маршрутах — в Лондон, Париж, Рим, Франкфурт, Вену, Шеннон, Стокгольм, Ларнаку, Астану, Костанай, Калининград и Москву. Учитывая большой спрос на авиаперевозки в столицу России, в настоящее время "Белавиа" выполняет рейс Минск—Москва—Минск четыре раза в день. Все рейсы в Москву выполняются из аэропорта Минск-2. Дневной рейс в Домодедово осуществляется на самолете Ту-134 вместо Ан-24, что позволяет увеличить скорость перелета.

РЕДКАЯ ТЕМА

Олег КОЗЛОВСКИЙ:

«Цыганам надо, чтобы их понимали и относились к ним как к людям»

Цыгане всего мира недавно отпраздновали очередной Международный день ромской нации. Кстати говоря, не все цыгане, проживающие в Республике Беларусь, знали об этом празднике, так как в нашей стране он отмечался только второй раз.

В тот день белорусские цыгане зажигали свечи у входа в свои дома в память обо всех ромах, погибших во время войн и гонений.

Цыгане — одно из национальных меньшинств, представление о котором грубо извращалось столетиями. Они подвергались давлению со стороны других культур, которые угрожали их самобытности и традиционному образу жизни. И сегодня цыгане создают свои объединения, диаспоры и ассоциации, причем, на глобальном уровне. Так, к примеру, в Организации Объединенных Наций зарегистрирован Международный союз цыган (Романи Юнион), образованный 8 апреля 1971 года в Лондоне на I Всемирном конгрессе цыган. "Романи Юнион" в 1979 г. получил в ООН консультативный статус.

В мае 1998 года в Комитете по делам религий и национальностей при Совете министров Республики Беларусь было зарегистрировано общественное объединение "Белорусская цыганская диаспора", которое ставит своей целью интеграцию цыган в современное общество, не забывая и о сохранении традиций и самобытности цыганского народа. Кроме того, в феврале 2003 года в Смоленске прошел Первый объединительный конгресс ромских общин СНГ и стран Балтии, где была образована Ассоциация ромов СНГ и Балтии "Амаро Дром" (что в переводе означает "Наша дорога"), чтобы сообща возрождать национальное самосознание, язык, культуру, а также решать всевозможные проблемы.

В последнее время усилилось внимание европейской общественности к цыганской проблеме, т.к. ромская нация является наиболее дискриминируемой и преследуемой. По мнению ОБСЕ, Евросоюза, в большинстве государств Европы сохраняется систематическая дискриминация цыган. В Европе распространяются расистские и неонацистские настроения, растет число экстремистских организаций. В связи с этим жертвами насилия на расовой почве, наряду с эмигрантами, становятся прежде всего цыгане. Европейский центр прав цыган (г.Будапешт) в период с 1990 по 1998 годы в государствах бывшего советского блока зарегистрировал 4500 актов насилия по отношению к цыганам, а в странах Евросоюза — 5800. Следует с гордостью сказать, что Беларуси в этом списке нет, возможно, потому, что цыгане — давняя составная часть многонациональной Беларуси: судя по историческим документам, они появились на территории нашей страны более 6 столетий назад.

Кстати говоря, цыган, проживающих в Беларуси, не так уж и мало. По данным переписи населения 1999 года, здесь проживает 9927 ромов. Правда, руководители цыганских диаспор отмечают, что на самом деле их значительно больше — порядка 60 тысяч человек.

Следует сказать, что не все так гладко во взаимоотношениях жителей Беларуси с цыганами, проживающими на ее территории. В массовом сознании в отношении людей ромской нации существуют все же негативные стереотипы. Правда, в нашей стране, по сравнению с другими государствами, они распространены незначительно, но все же присутствуют. Одним из них является, например, тот факт, что еще при СССР цыгане в экономике заняли нишу под названием "спекуляция". Теперь же, когда "спекуляцию" назвали "коммерцией" и официально разрешили, ею стали заниматься люди с высшим образованием и не цыгане.

Конечно, стереотипы надо искоренять, но это требует и времени, и терпения. *"И здесь мы, главным образом, нуждаемся в помощи средств массовой информации, — говорит глава общественного объединения "Белорусская цыганская диаспора"* **Олег Александрович Козловский**. — *Мы обратились к новому руководству Белтелерадиокомпании с просьбой создать на телевидении специальную программу, которая бы рассказывала о жизни и деятельности национальных меньшинств, проживающих в Беларуси"*.

Деятельность цыганских национально-культурных объединений поддерживают Комитет по делам религий и национальностей при Совете министров Беларуси, Министерство культуры и местные государственные органы. *"В качестве примера,* — говорит председатель Комитета по делам религий и национальностей при Совмине С.И.Буко, — *отмечу тесное сотрудничество Ошмянского райисполкома Гродненской области с недавно зарегистрированным цыганскимм объединением этого района. А среди наиболее важных мероприятий с участием цыган — всебелорусские фестивали национальных культур, которые проходят каждые два года в Гродно. Четвертый такой фестиваль был в 2002 году, на котором я тоже присутствовал. И видел, что перед сценической площадкой, на которой выступали цыгане, было больше всего народу"*.

Как отмечает О.Козловский, первоочередной задачей ОО "БЦД" является получение полноценного образования цыганской молодежью. Уже в 2003 году в вузы Беларуси поступило несколько молодых цыган. И господин Козловский надеется, что это — "первые ласточки", после которых высшее образование в цыганской диаспоре станет нормой. *"Если у нас будут действительно хорошие, образованные кадры, тогда мы сможем двигаться дальше",* — говорит глава ОО "БЦД". — *Что же касается получения высшего образования, то главной проблемой остается финансовая сторона вопроса. Если раньше высшее образование было бесплатным, то сейчас — в основном платное. "Я в 40 лет поступил в институт,* — поделился Олег Александрович, — *и, поверьте, никакой проблемы с этим не было. Наоборот, к этому относились, как к какой-то необычайной ситуации: мол, цыган, да в таких годах, и пришел учиться?!"*

ОО "БДЦ" ведет переговоры с Европейским центром по защите цыган (Будапешт), где им пообещали, что учеба цыганской молодежи, поступившей в вузы на дневное отделение, будет оплачиваться этим Центром.

Сегодня цыгане находятся в тяжелом социальном положении, т.к. остается насущной проблема трудоустройства. *"Если бы в нашей стране официально разрешили занятие гаданием,* — говорит О.Козловский, — *то многие бы цыгане трудоустроились. Ведь гадание — это исконно цыганское ремесло, оно у нас в крови. Мы обращались, правда, пока устно, к белорусским госорганам, чтобы нашему народу разрешили официально заниматься гаданием. Мы бы платили налоги и занимались делом. Как говорится, и государству было бы хорошо, и нашему народу, который смог бы наконец занять свою нишу и нормально существовать. Ведь из-за отсутствия работы возникает такой момент, как криминал.*

А многие из наших людей находятся за чертой бедности и оказать им помощь — одна из задач нашего объединения. Так, в декабре 2002 года мы помогли престарелым цыганам — жертвам Холокоста продуктами питания и средствами личной гигиены, а в сентябре 2003 года плюс к этому оказали помощь в оплате задолженностей по коммунальным услугам и в покупке теплых вещей".

По поводу цыганского гадания у наших людей также имеется стереотип. К кому из нас на улице не приставали цыганки: *"Дай погадаю! Всю правду скажу"*. И даже говорят, что и денег не надо, *"я просто помогу"*. А потом — ни цыганки, ни денег. И именно навязывание и вымогание денег отталкивает нас от самих цыган и тем более от их услуг по гаданию. Хотя, справедливости ради стоит сказать: то, что цыгане действительно умеют делать, так это гадать. Может, стоит и впрямь узаконить эту процедуру.

По словам О.А.Козловского, цыганскому народу нужно не так уж и много: защита, понимание и отношение к цыганам, как к людям. *"Хотя не в каждом государстве это понимают",* — говорит лидер.

Наталья ГУСЕВА.

Народная Воля
12 МАЯ 2004 г.

ЧТО ПРОИСХОДИТ В МИРЕ

НОВОСТИ

Афины: крыша наконец поехала

Раздвижная крыша — 17 тысяч тонн стекла и бетона — главного олимпийского стадиона, строительство которого еще не завершено в Афинах, наконец начала сдвигаться на положенное место.

Представители Международного олимпийского комитета (МОК) провели проверку готовности объектов к летней Олимпиаде в Греции. Менее чем за 100 дней до начала Игр около трети объектов еще не завершены. Особую озабоченность вызывает раздвижная крыша главного олимпийского стадиона — именно к визиту высоких гостей приурочена первая попытка соединить ее половинки.

Рейды в Газе оставили «сотни без крыши над головой»

В результате израильских военных рейдов в секторе Газа 1100 палестинцев остались без крыши над головой. С такими данными выступила ООН.

Агентство ООН по делам палестинских беженцев заявляет, что уничтожение 130 домов стало одним из наиболее разрушительных за последние годы.

«Геликон-опера» вновь в Лондоне

Во вторник 11 мая в Лондоне начал гастроли московский театр "Геликон-опера" — один из самых интересных новых театральных коллективов, возникших уже в постсоветский период.

Годы перестройки принесли свежий ветер во многие виды искусств, в том числе и в оперу. На волне новых возможностей молодой — ему было всего 23 года — дерзкий режиссер Дмитрий Бертман в 1990 году придумал новый театр и назвал его "Геликон".

В отличие от могущественных монументальных постановок Большого или Мариинки, "Геликон" с самого начала сделал упор на камерность, на новое оригинальное прочтение хорошо знакомой классики и, конечно же, на восстановление забытых или и вовсе российской публике не известных, игнорировавшихся советским официозом оперных шедевров.

Человек недели — Михаил Саакашвили

Человеком прошлой недели Радио "Свобода" признал президент Грузии Михаил Саакашвили, установивший полный контроль над Аджарией и одолевший Аслана Абашидзе.

Человека недели представил Георгий Кобаладзе.

Георгий Кобаладзе: XXI век в Грузии наступил 23 ноября 2003 года, когда в результате многотысячных митингов грузинской молодежи ушел в отставку Эдуард Шеварднадзе, человек из прошлого века, попытавшийся, и не совсем безуспешно, опираясь на свой уникальный политический талант, обмануть время. Новая эпоха и новый век вывели на сцену грузинской истории своего ставленника — Михаила Саакашвили.

Он истинный и полноправный представитель поколения, появившегося на свет в 60-х годах XX века, носящий все его достоинства и пороки. Главные из них — внутренняя раскрепощенность и абсолютная нескованность. Это поколение, которое хихикало над Брежневым и его наследниками во время так называемой "пятилетки похорон".

Миша вышел из элитной интеллигентной семьи. То есть грузинская интеллигенция, трясущаяся от страха в 30—50-х годах, сумела воспитать поколение Миши Саакашвили. И самое удивительное, что, вопреки всему, он добивается успеха. Ведь кто мог подумать после ужасной национальной трагедии конца 80-х — начала 90-х годов, что Грузия когда-либо сможет подняться, когда-либо сумеет решить хотя бы одну проблему от коррупции до авторитарного режима в Аджарии.

Кто знает, может быть, для народов бывшего Советского Союза именно выход на сцену представителей этого поколения был бы началом решения проблем, оставшихся грузом прошлого.

В ЗЕРКАЛЕ МИРОВОЙ ПРЕССЫ

Чечня без Кадырова

В прошлом на жизнь Ахмада Кадырова покушались несколько раз. На этот раз предотвратить его гибель не удалось, замечает **Би-Би-Си.** Скорее всего, теракт был устроен чеченскими боевиками, считающими Кадырова предателем. Во время первой чеченской войны 1994—1996 годов он был на их стороне. У видного религиозного деятеля был свой вооруженный отряд. Однако позже он перешел на сторону Кремля и с течением времени стал президентом промосковской администрации. Любой член промосковской администрации — мишень для чеченских боевиков.

Для российской власти смерть Кадырова, делает вывод Би-Би-Си, представляет невосполнимую потерю. Для Москвы это был сильный человек, пользовавшийся значительной долей уважения внутри Чечни. Таких в Чечне немного. И что еще более важно: Москва не успела взрастить ни одного возможного преемника. Она отказывается вести переговоры с боевиками, поэтому теперь ей нужны другие достойные представители чеченской общины. А таких у нее нет.

"Немецкая волна" высказывает такое мнение: "Для Путина смерть его наместника в Чечне является крупным политическим ударом. Ведь президент России возлагал большие надежды на Ахмада Кадырова, доверив ему восстановление и политическую стабилизацию республики. При этом, делая ставку на Кадырова, Путин не обращал внимания на все предостережения экспертов. Кремлевского шефа мало интересовал тот факт, что его ставленник организовал свою собственную армию и службу безопасности, как и то, что организации по правам человека выдвигали в адрес администрации Кадырова обвинения в проведении противозаконных арестов и пыток заключенных. В свою очередь Кадыров оказал полную поддержку Путину на президентских выборах в России, заявив, что он считает Путина единственным правильным кандидатом на пост президента страны".

Британская газета **"Таймс"** пишет: "Это убийство демонстрирует Москве и всему миру, что заявления президента Путина о том, что война в Чечне закончилась и что в республике идет нормализация, весьма далеки от истины. Убийство человека, чье избрание на пост президента Чечни было организовано Москвой для того, чтобы придать видимость легитимности марионеточному правительству в Грозном, поставило Россию перед лицом политического вакуума". По мнению **"Дейли телеграф",** в более рациональном мире Путин одновременно с борьбой с экстремистами начал бы переговоры с Асланом Масхадовым, который был избран чеченским президентом в 1997 году. Тем самым можно было бы найти политическое решение проблемы, приемлемое для большинства населения республики. Однако Кремль заявляет, что Масхадов — террорист, тем самым лишая себя наиболее реалистичного партнера на переговорах.

"Одним из самых тяжелых поражений российской политики на Кавказе" называет убийство Кадырова германская **"Тагесцайтунг".** "Москве придется начинать все сначала в мятежной республике", — пишет она, отмечая, что смерть Кадырова уничтожила "фасад нынешнего мирного процесса". Конфликт в Чечне не может быть разрешен назначением, как выражается "Тагесцайтунг", "очередной марионетки". Однако она полагает, что это не приведет к заметным переменам в обозримом будущем. "Кремль будет продолжать опираться на пресловутую силу оружия, несмотря на то, что с каждым днем этот путь все более очевидно ведет в тупик", — пишет берлинская газета.

События глазами фоторепортеров

Палестинские дети убегают от израильского танка во время вторжения в селение Деир Балах в секторе Газа.

Восьмилетний Тадааки Сато учится работать на компьютере.

Маори, коренные жители Новой Зеландии, протестуют против планов национализации береговой линии страны.

ШТО ТАМ, У ГЕРМАНІІ

Кожная краіна — непаўторны свет. Паўсюдна адбываюцца неардынарныя падзеі, нараджаюцца наватарскія традыцыі... Яны ўяўляюць не толькі цікавасць, але і вялікі практычны вопыт. Давайце з гэтага пункту гледжання зірнём на Нямеччыну, пабачым, што там новага, нетрадыцыйнага.

Сметніца, якая дзякуе

Чалавек кідае пакамечаную паперку ў сметніцу і адтуль чуецца: "Вялікі дзякуй". Мужчына здзіўлена азіраецца, нікога паблізу няма. І тут ён здагадваецца, што "гаворыць", відаць, сметніца. Шукае наўкол якое смецце, кідае яго ў яе і зноў чуе: "Вялікі дзякуй". На яго твары — усмешка.

Першыя такія сметніцы з'явіліся ў Берліне. Большасць прахожых, пачуўшы падзяку ад іх, тут жа шукаюць наўкол якое смецце, каб яго выкінуць сюды, ды наўкол яго няпроста знайсці.

Чып-карта для пацыента

Тры федэральныя землі Германіі — Паўночны Рэйн-Вестфалія, Рэйнланд-Пфальц і Шлезвіг-Гальштэйн — рыхтуюцца да рэалізацыі важнага праекта — увядзення чып-карты для пацыентаў. Пасля таго як у гэтых рэгіёнах будуць апрабаваны розныя канцэпцыі і падыходы, лепшыя з іх пачнуць распаўсюджваць па ўсёй краіне.

Чып-карта будзе заведзена на кожнага пацыента. На яе будуць заносіцца ўсе даныя аб стане здароўя таго ці іншага чалавека — усе аналізы, дыягназы, рэцэпты, падрабязнасці яго лячэння, рэакцыя арганізма на розныя лекі... Словам, урач, азнаёміўшыся з такой картай, будзе мець усю неабходную інфармацыю аб здароўі чалавека, яго патэнцыяле і слабасцях. Усё гэта ўзнімае ўзровень прафілактыкі і лячэння на новы, сучасны ўзровень.

Мяркуецца, што электронна-лічбавая эра ў ахове здароўя пачнецца з 1 студзеня 2006 года. А пакуль ствараюцца лакальныя камп'ютэрныя сеткі ў названых рэгіёнах. Эксперыментам ахоплена каля 50 тысяч пацыентаў. Усе даныя аб стане здароўя будуць закадзіраваны, пазнаёміцца з імі можна, толькі ведаючы пароль.

Лекцыю па эканоміцы чытае футбаліст

Гэта можа здацца неверагодным, але такое можна было назіраць у берлінскім універсітэце імя Гумбальдта. З лекцыяй перад студэнтамі эканамічнага факультэта выступіў былы капітан зборнай Германіі па футболе, а цяпер спартыўны каментатар Алівер Бірхоф. Тэма выступу: "Чаму можа навучыцца грамадства ў спартсменаў".

Вядома, выступоўцу не ўдалося пазбегнуць футбольнай тэрміналогіі. "Германія сёння нагадвае мне футбольную каманду, якая аказалася ў канцы турнірнай табліцы, — гаворыць лектар. — Перамог мала, усе незадаволеныя, ніхто толкам не разумее, як яна дакацілася да такога жыцця. Усе бачаць, што трэба нешта рабіць, але ўсе чакаюць, што зробіць гэта іншы ігрок".

Як бачым, даволі вобразна і трапна сказана аб сённяшняй эканамічнай сітуацыі.

Якія ж яго эканамічныя рэцэпты? Стварыць лепшыя ўмовы для грамадскіх эліт і прадпрымальнікаў, правесці лібералізацыю рынка, укараніць больш гнуткую сістэму аплаты, аблегчыць звальненне рабочых і служачых... І наогул, чым менш дзяржава ўмешваецца ў эканамічныя гульні, тым лепш гуляе каманда. "Захаваць сваё месца ў сучасным свеце — гэта няправільная ўстаноўка. Мэта павінна быць адна — стаць чэмпіёнам, — кажа Бірхоф. — Але як гэтага дасягнуць? Мы, футбалісты, у такіх выпадках гаворым: трэба ісці на прарыў, для чаго неабходна ўдыхнуць новыя сілы ў каманду. А каб зрабіць гэта, варта змяніць трэнера".

Намёк відавочны, на канцлера Шродэра.

Лекцыя выклікала вялікую цікавасць. Трэба нагадаць, што футбаліст і каментатар Бірхоф мае вышэйшую эканамічную адукацыю, так што някепска разбіраецца ў эканоміцы. Да таго ж з'яўляецца мультымільянерам. Так што яго парада студэнтам не чакаць падачак і мудрых рашэнняў ад "трэнера" і ўрада, а самім каваць свой лёс, як кажуць, не высмактана з пальца, а ўзята з уласнага вопыту.

А запрашаць неардынарных лектараў — даўняя традыцыя нямецкіх універсітэтаў.

У клубе смеху

Шэсць гадоў таму ў Германіі з'явіўся першы клуб смеху. Цяпер іх — 40. Людзі збіраюцца і старанна, зараз-ліва смяюцца. Яны перакананы, што смех мае лекавае ўздзеянне на душэўны стан чалавека, умацоўвае яго здароўе. Калі чалавек смяецца ды ад усёй душы, тады мускулатура яго цела прыходзіць у рух, дыяфрагма вібрыруе, дыханне паглыбляецца, у лёгкія трапляе больш кіслароду. Словам, стымулюецца работа многіх мышцаў, знікае стрэс і павышаецца імунітэт усяго арганізма.

Асістэнт па тэлефонных званках

Вы не ведаеце, што гэта за прафесія? Тады пачытайце, мабыць, хутка яна з'явіцца і ў нас. У Германіі ж каля паўмільёна чалавек займаецца такой моднай працай.

Сёння нумары тэлефонаў фірм упрыгожваюць практычна кожны тавар. Калі вы хочаце нешта распытаць пра сваю пакупку альбо не зразумелі надпіс і коды на ўпакоўцы, дык можаце патэлефанаваць па ўказаным тэлефоне. У трубцы вы пачуеце голас асістэнта па тэлефонных званках, які растлумачыць усё, што вас цікавіць.

Працуюць такія спецыялісты ў так званых кол-цэнтрах фірм і прадпрыемстваў. Адказы на званкі — толькі частка іх працы. Другая — апытанні спажыўцоў. Яны самі тэлефануюць грамадзянам і цікавяцца, якія тавары і чаму яны набылі ці збіраюцца прыдбаць, чым іх задавальняе пакупка і чым — не. Па тэлефоне яны могуць вас пазнаёміць з навінкамі сваёй фірмы, прапанаваць набыць яе.

Сетка такіх кол-цэнтраў імкліва пашыраецца. З 1995 года колькасць рабочых месцаў у іх вырасла з 30 да 200 тысяч. Калі ўлічыць, што на кожным рабочым месцы ўвіхаецца па два, а то і тры чалавекі (справа ў тым, што асістэнтамі часта працуюць студэнты па 4—5 гадзін на дзень), дык у новым бізнесе занята каля паўмільёна чалавек.

У Берліне пачала працу кол-цэнтр-акадэмія, у якой павышаюць свае веды супрацоўнікі кол-цэнтраў. У праграму навучання ўваходзяць такія дысцыпліны, як псіхалогія, рыторыка, педагогіка. Словам, вучаць даходліва даносіць да слухачоў самую складаную інфармацыю. Нямецкія прафсаюзы пачалі барацьбу за правы работнікаў кол-цэнтраў, патрабуючы, каб кожны з іх меў гукаізаляваны кабінет, або адлегласць да суседняга рабочага месца была не менш як 56 сантыметраў, на падлогу было пасцелена дывановае ці драўлянае пакрыццё, паколькі "лінолеум шкодны".

Самі ж спажыўцы ставяцца да новых спецыялістаў па-рознаму. Адны задаволены, што маюць магчымасць па тэлефоне атрымаць любую кансультацыю па таварах, другія злуюць, што званкі "няпрошаных гасцей" здараюцца ў самы непадыходзячы момант: калі плача дзіця ці ёсць неадкладныя справы на кухні.

Дзень дачкі

Днямі ён прайшоў у Германіі. Прайшоў ужо ў чацвёрты раз. Сёлета — пад дэвізам: "Вазьміце сваіх дачок з сабой на работу". У гэты дзень тысячы школьніц пабывалі на прадпрыемствах і фірмах, знаёміліся з іх працай і найперш з прафесіямі.

На думку арганізатараў мерапрыемства, дзяўчаты пакуль неахвотна выбіраюць тэхнічныя прафесіі. Прычына таму — слабае веданне пра іх. Між тым даследаванні паказваюць, што вялікая прысутнасць прадстаўніц прыгожай паловы грамадства ў сферы вытворчасці і бізнесу прыносіць значны эканамічны плён. Да таго ж і ў Германіі занепакоены тым, што сапраўднага раўнапраўя між мужчынамі і жанчынамі пакуль няма. Таму мяркуюць, што падобнае мерапрыемства ў нейкай ступені дапаможа выраўняць шанцы на кар'еру і выбар прафесіі.

Шпалеры ад адзіноцтва

У Германіі расце колькасць адзінокіх людзей. І з'яўляецца ўсё больш неардынарных ідэй па паляпшэнні іх жыцця.

Не так даўно ў продажы з'явіліся кампакт-дыскі, на якіх запісаны гукі паўсядзённага сямейнага жыцця. Уключыш такі дыск, і чуецца шум пыласоса, скрып дзвярэй, шэлест старонак кнігі, крокі па падлозе, звон посуду і журчанне вады з крана, пакашліванне... Словам, поўнае адчуванне, што ты ў кватэры не адзін.

А нядаўна з'явіліся шпалеры для... адзінокіх. А дакладней, фоташпалеры. З іх дапамогай можна так афарміць кватэру, што ў ёй у кутку будзе "сядзець прыгожы мужчына ці прыгожая жанчына з кнігай ці кубачкам кавы". Высокая якасць фоташпалераў дазваляе ствараць эфект "сапраўднай прысутнасці" іншага чалавека ў пакоі. У продажы з'явіліся шпалеры з сюжэтамі для кухні, гасцінай і нават для... ваннай і спальні.

Іван МАКАЛОВІЧ.

ДУХОЎНЫ СКАРБ

150 пытанняў і адказаў з гісторыі Беларусі

130. Якія былі мэты польскага змагання з беларускім нацыянальным рухам у Заходняй Беларусі?

Польскія ўлады ў 20—30-х гадах праводзілі ў Заходняй Беларусі палітыку паланізацыі карэннага насельніцтва, каб зрабіць край этнічна польскім і такім чынам назаўсёды замацаваць сваё панаванне на нашых землях. "Крэсы Усходнія" — як яны называлі беларускія землі — мелі для тагачаснай Польшчы выключнае, перадусім эканамічнае, значэнне. Так, у бюджэце на 1924 год першыя два месцы ў структуры польскага экспарту займалі беларускі лес і ўкраінская нафта. Беларуская сыравіна і прадукцыя сельскай гаспадаркі (асабліва лён і вырабы з яго) фактычна трымалі канвертоўнасць польскай залатоўкі ў Еўропе. Вывозячы з беларускіх земляў каштоўную сыравіну, Польшча навадняла яе неканкурэнтнымі на еўрапейскім рынку нізкаякаснымі таварамі.

Беларускае насельніцтва было заўсёдным чыннікам нестабільнасці, а пры пашырэнні нацыянальна-вызвольных ідэяў становілася адкрыта пагрозлівай і варожай для польскай акупацыі сілай. "Вогнішча беларушчыны", паводле аднаго з ідэолагаў польскай каланізацыі Заходняй Беларусі У.Студніцкага, стварала б сур'ёзную пагрозу каланіяльным планам Польшчы. Нездарма дзейнасць у Заходняй Беларусі нацыянальных арганізацый па выхаванні самасвядомасці, прапагандзе ідэі аб'яднання ўсіх беларускіх земляў у адну дзяржаву, выданне беларускамоўнай літаратуры, адкрыццё школ і навуковых устаноў, іншыя формы працы выклікалі рэпрэсіі з боку польскай улады.

Браніслаў Тарашкевіч, адзін з лідэраў нацыянальна-вызвольнага руху ў Заходняй Беларусі, знакаміты вучоны ў галіне мовазнаўства, аўтар першай навучальнай беларускай граматыкі, першы старшыня Таварыства беларускай школы.

Быў у ліку арганізатараў і кіраўніком 120-тысячнай Беларускай Сялянска-Работніцкай Грамады. За сваю палітычную дзейнасць двойчы сядзеў у польскай турме. Знаходжанне там выкарыстаў для творчай працы: пераклаў на беларускую мову "Іліяду" Гамера і "Пана Тадэвуша" Адама Міцкевіча.

У верасні 1935 года польскія ўлады выменялі зняволенага Б.Тарашкевіча на беларускага пісьменніка Францішка Аляхновіча, які сядзеў тады ў савецкім канцлагеры.

А неўзабаве пасля гэтага, у траўні 1937 года, Тарашкевіч быў арыштаваны ў СССР і загінуў як "вораг народа". Гэткі ж лёс напаткаў і яго ных паплечнікаў, якія занадта даверыліся бальшавікам.

Арышты беларускіх настаўнікаў і дзеячаў культуры, канфіскацыя газет і часопісаў, зачыненне беларускіх гімназій у Барунах, Наваградку, Клецку, Радашкавічах ды іншых месцах, публічныя судовыя працэсы над нашымі патрыётамі, катаванні беларускіх дзеячаў у Лукішках, Картуз-Бярозе, Вронках ды іншых турмах, дыскрымінацыйнае ў дачыненні да беларускага насель-ніцтва школьнае, аграрнае, рэлігійнае заканадаўства — вось далёка не поўны пералік рэалій з жыцця Заходняй Беларусі пад польскай уладай.

Уціск і дыскрымінацыя беларусаў набылі такія памеры, што супраць гэтага пачала выказваць свой пратэст міжнародная грамадскасць і нават некаторыя польскія дзеячы, як, напрыклад, С.Жаромскі, а таксама пасобныя палітычныя арганізацыі.

Юрась КАЛАЧЫНСКІ.

131. Як Вільня сталася жамойцкім горадам?

У міжваенным перыядзе (1921—1939 гады) Вільня была палітычным і культурным цэнтрам Заходняй Беларусі, яе неафіцыйнай сталіцай. Тут знаходзіліся сядзібы ўсіх беларускіх палітычных і грамадскіх арганізацый, працавалі беларуская гімназія, беларускі музей, шэраг навуковых і культурна-асветных установаў, рэдакцыі газет і часопісаў. Праўда, становішча ўвесь час мянялася да горшага, і напярэдадні Другой сусветнай вайны колькасць іх у выніку шавіністычнае палітыкі польскіх уладаў значна зменшылася.

Пасля прыяднання Заходняй Беларусі да БССР беларускае грамадзянства Вільні было перакананае, што горад будзе нарэшце ў складзе беларускай рэспублікі. Афіцыйныя савецкія ўлады нават наладзілі масавую ўрачыстасць з нагоды далучэння Вільні да Беларусі "на векі вякоў". Была створаная Віленская вобласць, пачала выходзіць, як і ў іншых абласных цэнтрах, газета "Віленская праўда" на беларускай мове. Але сталася інакш.

10 кастрычніка 1939 года Сталін перадаў Вільню з Віленскім краем (гэта быў абшар з насельніцтвам 457 тысяч чалавек) Летуве. Нарком замежных справаў СССР Молатаў адзначаў тады: "Мы ведаем, што бальшыня насельніцтва гэтага абшару не летувіская. Але гістарычнае мінулае ды імкненні летувіскага народа цесна звязаны з горадам Вільня, і ўрад СССР уважаў за неабходнае шанаваць гэтыя маральныя фактары". Зразумела, што такое "дабрадзейства" мусіла быць аплочанае. Напачатку Масква атрымала права на размяшчэнне ў Летуве вайсковых базаў, а неўзабаве, як вядома, і ўвогуле "праглынула" яе.

Пасля далучэння Віленшчыны да Летувы жамойцкае насельніцтва горада (а яго ў 1939 годзе было тут 2%) пачало імкліва ўзрастаць за кошт перасяленцаў з этнічных жамойцкіх земляў. Адбывалася гэта і дзякуючы прытоку рабочых рук у прамысловасць, і ў выніку наплыву масы чынавенства, паліцыі, войска.

Становішча беларусаў тут сталася яшчэ горшае, чым за палякамі. Летувіская прапаганда сцвярджала, што яны не беларусы, а "страчаныя летувісы", што ім трэба толькі змяніць прозвішча, дадаўшы "-ас", "-іс" або "-ус", ды навучыцца жамойцкай мове. Беспрацоўе сярод беларусаў павялічылася, яны дыскрымінаваліся пры ўладкаванні на дзяржаўную службу. Тыя ж з іх, хто нарадзіўся па-за Віленшчынай, увогуле не маглі дастаць летувіскае грамадзянства.

У часе вайны ініцыятарамі карных захадаў з боку немцаў супраць нацыянальна свядомых беларусаў часта былі польскія шавіністы. Гэта разам з перадваеннымі сталінскімі рэпрэсіямі спрычынілася да катастрафічнага змяншэння колькасці беларускай інтэлігенцыі ў Вільні. І ўсё ж такі ў вайну тут яшчэ працавалі беларуская гімназія, настаўніцкая семінарыя, пачатковыя школы, выдавалася газета.

Паводле "Каляндарных нататак" Адама Станкевіча, пры канцы вайны летувісы панічна баяліся беларусаў, справядліва мяркуючы, што іхны актыўны калабарацыянізм, з аднаго боку, і шырокі супраціў беларусаў фашысцкай акупацыі ды іх каласальныя ахвяры, з другога, могуць даць падставу для паваеннага перагляду лёсу Вільні. Але Сталін, падобна, не палічыў патрэбным вяртацца да гэтага пытання.

Канчатковае знішчэнне беларускага культурнага асяродку ў Вільні адбылося адразу пасля вайны. Летувіскі ўрад у асобе міністра асветы Ю.Жугжды не дазволіў адчыніць тут ніводнай беларускай школы, чаго дамагаліся А.Станкевіч ды іншыя беларускія дзеячы. Былі ліквідаваныя беларуская гімназія, настаўніцкая семінарыя, славуты музей імя І.Луцкевіча. Усё гэта адбывалася адначасна з новай хваляй рэпрэсій супраць нашай інтэлігенцыі. Практычна ўсе беларускія нацыянальныя дзеячы і іх сем'і падпалі пад арышты і дэпартацыю.

Па ўзгадненні з Масквой і Варшавай замест беларускіх школаў пачалі насаджацца польскія і расейскія, было наладжанае выданне газеты "Чырвоны штандар" на польскай мове. Як і раней, польскія ксяндзы стараліся ўбіць у галовы беларусам-каталікам, што ў сапраўднасці яны палякі. У гэтым былі зацікаўленыя і летувіскія ўлады. Яны, відаць, не бачылі іншага спосабу дэнацыяналізаваць беларусаў Віленшчыны, бо разумелі, што перавярнуць іх на жамойтаў досыць праблематычна.

Тым не менш маючы на мэце змяніць дэмаграфічную сітуацыю на сваю карысць, яны імкнуліся накінуць беларусам хоць бы сваю вонкавую абалонку: дзе толькі магчыма, запісвалі іх жамойтамі, перакручвалі імёны і прозвішчы на свой капыл (*Міцкявічус* замест *Міцкевіч, Васіляўскас* замест *Васілеўскі, Астраўскайтэ* замест *Астроўская, Жвірбліс* замест *Верабей* і г. д.).

Адначасова ажыццяўлялася масавае перасяленне ў Вільню сялянаў з этнічнай Летувы. На працягу толькі 1944—1946 гадоў сюды панаехала блізу 100 тысяч новых жыхароў, а ўсяго да пачатку 1950 года — больш за 150 тысяч. Гэты працэс доўжыўся і ў наступныя дзесяцігоддзі.

Праводзілася таксама татальная летувізацыя тапанімікі Вільні і Віленскага краю (*Меднікі* сталі *Мядзінінкай, Свянцяны — Швянчоніс, Салечнікі — Шальчынінкай, Вострая Брама — Аўшрас* і г. д.).

Такім чынам Вільня набыла нязвыклае для сябе аблічча, упершыню за сваю шматсотгадовую гісторыю стаўшы жамойцкім горадам.

Эдвард ЗАЙКОЎСКІ.
Тэксты да ілюстрацый падрыхтаваў Зьміцер САНЬКО.

На схематычнай карце 1939 года паказана беларуская этнічная тэрыторыя з Вільняй, аддадзеная Летуве паводле дамовы паміж Масквой і Каўнасам 10 кастрычніка 1939 года.

Думаем, нашаму чытачу цікава будзе даведацца, як у 1944 годзе, пасля выгнання немцаў, разглядалася пытанне пра мяжу паміж Беларуссю і Летувой. Вядомы летувіскі пісьменнік Юстас Палецкіс быў тады ў складзе ўрадавай дэлегацыі (як старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета ЛССР) на прыёме ў Сталіна. Ён і распавёў гэтую гісторыю на таварыскай вячэры падчас свята беларускай паэзіі ў Вільні 20 лістапада 1978 года:"Ужо дагэтуль меркавалі пра лёс Вільні і баяліся, што яна нам не дастанецца. Бо ведалі, што Беларусь вельмі пацярпела ў вайне і там актыўна змагаліся з немцамі, тым часам як у нас усё было не так. Сядзім, маўчым да нейкага часу. Ён, Сталін, і кажа: "Ну, што вы тут мяркуеце?" Мы муляемся, не адважваемся сказаць. А ён і гаворыць: "Я думаю, што мяжа павінна прайсці, ну... вось так", — і пазногцем правёў па карце. Тады мы, узрадаваныя, з палёгкай (Вільня з нашага боку!) падаліся да карты, падправілі штокольвечы. Так мы здабылі Вільню".

Народная Воля

12 МАЯ 2004 г.

БУДЬТЕ ЗДОРОВЫ!

Пародонтит: как его избежать?

Белые и ровные зубы — только полдела. Не менее важны и здоровые десны. Правильно ухаживая за ними, ты сохранишь красоту улыбки на долгие годы!

Обаятельная улыбка вызывает доверие и симпатию, ослепительная — делает нас неотразимыми. Поэтому не удивительно, что мы так заботимся о здоровье зубов. Но вот о здоровье десен часто забываем...

А ведь красоте улыбки угрожает не только кариес. Проблемы могут появиться и у людей, зубы которых абсолютно здоровы. Виноваты в этом бактерии, вызывающие заболевания десен — в частности, пародонтит.

Его часто путают с пародонтозом, но это разные заболевания. Нужно помнить, что пародонтоз — одно из самых опасных осложнений пародонтита, а последний в свою очередь — одно из наиболее распространенных заболеваний полости рта.

Чем опасен пародонтит

Причина пародонтита — так называемые грамотрицательные бактерии. Они чаще всего скапливаются в зубном камне, который является для них питательной средой и удобным "домом" (микробы гнездятся в его пористой поверхности). В благоприятных условиях бактерии быстро размножаются, вызывают воспаление десен, повреждают ткань между деснами и зубом — в итоге разрушают сам зуб. Поэтому пародонтит, если его вовремя не лечить, может быть очень опасным. Обычно это заболевание сопровождают:

* кровоточивость десен;
* неприятный запах изо рта;
* обнажение и повышенная чувствительность (особенно к холодному и горячему) шейки зуба;
* нарушение зубодесневого прикрепления;
* расшатывание и даже выпадение зубов;
* образование десневых карманов.

Слово экспертам

Михаил ВОРОНОВ, врач-стоматолог:

— Даже очень здоровый организм не справится сам с пародонтитом! Он, конечно, быстро отреагирует на то, что болезнь развивается, и начнет вырабатывать антитела, но в процессе борьбы уничтожит не только вредные микроорганизмы. Антитела настолько сильны, что могут уничтожить ткань пародонта. В результате болезнь начнет развиваться еще быстрее. Если не лечиться, потеря зубов неизбежна.

В каком возрасте он появляется

Многие считают, что пародонтит бывает только у пожилых людей. Это не так. Вызывающие болезнь бактерии можно обнаружить даже у маленького ребенка. Пародонтит возникает незаметно и может развиваться в течение нескольких лет. Сегодня из-за неправильного образа жизни и питания к стоматологу все чаще попадают 20-летние пациенты с диагнозом "пародонтит".

Кто подвержен этой болезни

К сожалению, от нее никто не застрахован. По статистике, пародонтитом болеет каждый десятый житель планеты. Но больше других рискуют заболеть те, кто:

* много курит и пьет кофе — так как это способствует быстрому образованию зубного камня;
* не следит за полостью рта;
* болен диабетом, так как повышенный уровень сахара способствует развитию бактерий;
* унаследовал соответствующие биологические особенности организма (например, у родителей был пародонтит);
* страдает нарушением прикуса;
* страдает ослабленной функцией железы, отвечающей за отделение слюны — она обладает антибактериальными свойствами;
* имеет дурную привычку постоянно что-то жевать (и таким образом все время поставляет бактериям дополнительную пищу);
* находится в пожилом возрасте (у них ослаблена естественная способность организма восстанавливать, то есть регенерировать, поврежденную ткань).

Как уберечься от болезни

От пародонтита можно уберечься, главное — не запускать болезнь. Чем раньше вы предпримете меры, тем лучше будет результат.

* **Правильно чистите зубы!** Делать это нужно хотя бы два раза в день — обязательно после завтрака и ужина. Таким образом регулярно удаляются образующийся на коронке зуба налет и бактерии. Часто можно слышать: съешьте после обеда яблочко — и нет проблем! Оно, дескать, естественным образом очищает зубы. Это не так. Напротив, если съедите что-нибудь из фруктов, рот нужно прополоскать, чтобы удалить фруктовые кислоты, ослабляющие эмаль. Чистить зубы надо круговыми движениями в течение трех минут. Это делается не только в целях соблюдения гигиены, но и для того, чтобы помассировать десны. Не сокращайте эту процедуру, даже если ваши десны кровоточат (самая частая ошибка). Если вы не уверены в том, что правильно чистите зубы, проконсультируйтесь со стоматологом.



* **Купите хорошую зубную щетку.** Щетина должна быть мягкой или средней мягкости из синтетического волокна. Зубную щетку следует менять не реже, чем раз в три месяца (если пользуешься электрической щеткой, обязательно меняй насадку). Щетка должна храниться в вертикальном положении. Ни в коем случае не храни ее в футляре (это способствует моментальному возникновению и размножению бактерий!).
* **Непременно используйте зубную нить.** С ее помощью можно удалить налет и самые крохотные остатки пищи, застрявшие между зубами. А вот зубочистки лучше не применять. Они приводят к расшатыванию зубов и увеличению расстояния между ними.
* **Пользуйтесь зубным эликсиром для полоскания.** Он размягчает десны перед чисткой зубов, кроме того, помогает удалить остатки пищи и дезинфицирует полость рта. Теми же свойствами обладает настой шалфея и ромашки (купите травы в аптеке и заварите 1 пакетик на стакан воды).
* **Удаляйте налет и зубной камень.** Это вы не сможете сделать самостоятельно — лучше обратитесь к специалисту. Эту процедуру, ставшую сегодня безболезненной, проводят с помощью ультразвука (который разбивает и удаляет камень и осадок) и песка (для шлифовки поверхности). Удаление камня предотвращает размножение бактерий, зубы становятся белыми и более гладкими.
* **Не курите** или уменьшите количество сигарет.
* Если нет возможности почистить зубы после еды, **обязательно пожуйте жевательную резинку (Orbit, Stimorol) или прополощите рот.**

("Алина".)

Это надо знать

Если болезнь уже развивается

Обнаружив симптомы пародонтита, не отчаивайся. Современные методы лечения помогут избавиться от этого недуга.

Без антибиотиков не обойтись

При появлении первых симптомов пародонтита (раздражение десен, кровоточивость и т.д.) примите срочные меры:

* принимайте антибиотики в таблетках (те, которые посоветует врач) или смазывайте десны мазями, содержащими антибиотики;
* удалите налет и зубной камень с коронки зубов и из зубодесневых карманов.

Восстановление ткани

При запущенном пародонтите важно удалить отложения зубного камня с корней зубов. Это позволяет избавиться от поврежденной болезнью ткани и живущих в ней бактерий. Освобожденный зуб заживает, формирует новую надкостницу зубного корня и снова крепко сидит в лунке.

Спасение для расшатанных зубов

При серьезном и запущенном поражении десен, когда зубы начинают расшатываться, помимо удаления зубного камня и лечения их придется укрепить (лигатура — укрепление зубов, например, проволочные с композитом, или шинирование — с добавлением отсутствующего зуба).

Последствия

Самое опасное и тяжелое осложнение — пародонтоз, при котором происходит атрофия тканей, окружающих корень зуба, а затем и выпадение зубов.

АЛІМПІЯДА-2004

Афіны пакуль што не гатовы да правядзення Алімпіяды...

У сакавіку менавіта пад такім загалоўкам выйшаў матэрыял у нашай газеце. У ім распавядалася аб тым, што падрыхтоўчыя работы да правядзення Алімпіяды ў самым разгары.

Як кажуць, "воз и ныне там". Пакуль не даведзены да стопрацэнтнай гатоўнасці Алімпійскі стадыён — над ім пакуль так і не ўсталяваны дах. Без даху знаходзіцца і плавальны басейн. А ставіць новыя Алімпійскія рэкорды ў саракаградусную спякоту плыўцам, як вы разумееце, будзе не так зручна. Таму арганізатары плануюць перанесці спаборніцтвы плыўцоў на вячэрні час. Дарэчы, і тэставыя меры спартыўных аб'ектаў, якія павінны праводзіцца ў прысутнасці прадстаўнікоў усіх дэлегацый, будуць ажыццяўляцца самімі арганізатарамі.

Таксама пад пытаннем застаецца правядзенне парусной рэгаты ў межах алімпійскіх спаборніцтваў. У мінулым годзе з-за моцнага ветру не ўдалося належным чынам правесці юніёрскі чэмпіянат свету па акадэмічным веславанні, які праходзіў на "алімпійскай вадзе". Як расказаў шэф нашай алімпійскай місіі ў Афінах **Анатоль Іваноў**, зараз арганізатары тэрмінова ўзводзяць перашкоды ветру вакол трасы, дзе пройдзе рэгата. Але, калі што, то аргкамітэт пакідае за сабой права скараціць дыстанцыю рэгаты альбо перанесці час і нават дату спаборніцтваў... Напэўна, гэта першы падобны выпадак у гісторыі правядзення Алімпійскіх гульняў.

Пакуль невядома і дакладнае месца пражывання нашай дэлегацыі. Канешне ж, нашым лепш жыць побач з выхадцамі з былога Савецкага Саюза, але і гэта пакуль што нявысветлена. Як і меню, якое прапануюць спартсменам на Алімпіядзе.

Што тычыцца VIP-персон, да ліку якіх адносяцца старшыні ўрадаў, кіраўнікі міністэрстваў спорту, то іх плануецца размясціць на караблях, якія будуць стаяць у бухтах. Калі гэты варыянт камусьці не падыходзіць, то, калі ласка, нумар у камфартабельным гатэлі. За суткі пражывання ў ім прыйдзецца заплаціць 5000 еўра...

Адзінае, што можа супакойваць, гэта тое, што ўсе спартсмены будуць знаходзіцца ў аднолькавых умовах. І дай Бог, каб нішто не перашкодзіла нашым алімпійцам заваяваць запланаваных 25 медалёў...

Віталь ГАРБУЗАЎ.

Лідэр пацярпеў першае паражэнне

На чэмпіянаце Беларусі па футболе сярод каманд вышэйшай лігі прайшлі гульні шостага тура. Лідэр — мінскае "Тарпеда-СКА" пацярпела першае паражэнне. У Брэсце мінчане саступілі мясцоваму "Дынама" — 1:3. А мінскія дынамаўцы з такім жа лікам выйгралі ў гасцях у наваполацкага "Нафтана".

Барысаўскі БАТЭ атрымаў перамогу над геаграфічнымі суседзямі — жодзінскім "Тарпеда" з лікам 2:0.

Мазырская "Славія" прайграла ў Гродне мясцоваму "Нёману" — 0:1, а віцебскі "Лакаматыў" з такім жа вынікам саступіў у Магілёве "Дняпру-Трансмашу". Мінскі МТЗ-РЫПО выйграў дома ў бабруйскай "Белшыны" — 2:1. Нічыйным зыходам завяршылася супрацьстаянне футбольнага клуба "Гомель" і "Дарыды" з Мінскага раёна — 1:1.

Турнірнае становішча каманд:

	Г	В	Н	П	М	А
Тарпеда-СКА	6	5	0	1	8-3	15
БАТЭ	6	4	2	0	11-3	14
Дынама Мн	6	4	1	1	14-6	13
Тарпеда Жд	6	4	0	2	12-7	12
Гомель	6	3	2	1	12-8	11
Славія	6	3	0	3	7-6	9
Дарыда	6	2	2	2	7-8	8
Нёман	6	1	4	1	4-4	7
Шахцёр	5	1	3	1	6-6	6
Зорка-ВА-БДУ	5	1	3	1	8-9	6
МТЗ-РЫПО	6	1	3	2	7-12	6
Лакаматыў	6	1	2	3	6-7	5
Дынама Бр	6	1	2	3	5-8	5
Днепр	6	1	2	3	2-5	5
Нафтан	6	0	2	4	3-11	2
Белшына	6	0	2	4	4-13	2

ПОЗДРАВЛЯЕМ!


Мечтаю стать олимпийским чемпионом!

Вот такую новую цель поставил перед собой минчанин **Эдуард ЖИГАЛКО.** И в самом деле трехкратному серебряному призеру чемпионатов мира и Европы по тяжелой атлетике впору примерить уже и олимпийское золото. В 2005 году в Канаде на Олимпийских играх среди ветеранов!

За свою жизнь Эдуард Михайлович держал в руках золото если не центнерами, то килограммами. Известный ювелир был очень популярен среди модников столицы, делал прелестные украшения и для простого люда, а однажды не ударил лицом в грязь, когда выполнил срочный заказ первого секретаря ЦК КПБ Петра Мироновича Машерова, улетающего с дружеским визитом на Кубу к Фиделю Кастро.

Но все это было после службы в армии, которую Эдуард Михайлович проходил в Германии на секретном объекте на урановой шахте. Сами понимаете, такая секретность здоровья прибавить никак не могла. Напротив, сослуживцы Жигалко, как и он сам, чувствовали себя совсем не здоровяками. И тогда-то солдат начал неожиданно для себя "таскать железо", да так увлекся, что не расстается со штангой и до сих пор.

Быстро выполнив норму мастера спорта, белорус долгое время успешно выступал на республиканском помосте. Сейчас он через день обязательно посещает спортивный зал, сделанный, кстати, на дому, и за одну тренировку "перелопачивает" свои обязательные три-четыре тонны. Активно трудится в собственной фирме. И выглядит как огурчик! Поэтому недавно во время встречи с детьми из неблагополучных семей Эдуард Михайлович, сам уже дедушка и прадедушка, в порядке наглядной агитации за здоровый образ жизни легко отжался на брусьях из упора двадцать раз, чем поверг в искреннее изумление далеко не спортивных "пионеров". Поверьте, мало найдется нынче людей, запросто поднимающих над головой свой собственный вес! А Эдуарду Михайловичу такая забава нипочем!



Теперь вам понятно, почему на этот год он планирует стать чемпионом мира и Европы среди ветеранов, а потом замахнуться и на олимпийский пьедестал?!

Эдуарду Михайловичу Жигалко — 70! Мы от всей души поздравляем могучего ветерана-силача, желаем ему крепкого здоровья, долгих лет жизни и осуществления заветной мечты!

Владимир ДОВЖЕНКО.

«Крамбамбуля» + «Вопли Видоплясова»

Группа "Крамбамбуля" записывает новый материал на одной из минских студий. Ожидается, что первым результатом работы станет мини-альбом, который появится в продаже в конце мая.

В него войдут пилотные песни из всех новых проектов "Крамбамбули". Прежде всего будут записаны инструментальные партии для дуэтов с вокалистами украинских групп ***"Вопли Видоплясова"*** и ***"Мандры"***.

В мини-альбоме будет представлено по несколько песен из двух новых дисков "Крамбамбули", выход которых ожидается осенью. В записи песен для альбома, посвященного различным праздникам, уже приняли участие **Александр Куллинкович** и **Сергей Михалок.** Проект, посвященный восточным мотивам, в мини-альбоме будут представлять азербайджанские песни с новой вокалисткой "Крамбамбули" **Гюнешь Абасовой.**

Презентация мини-альбома "Крамбамбули" пройдет в рамках совместного концерта с группой "Вопли Видоплясова", который состоится ***21 мая*** в Концертном зале "Минск".

Евелина КРУПЕНЬКИНА.

Кораблик детской радости

Для 30 детишек из белорусских детских домов и хосписа минувшая суббота, несмотря на дождливую погоду, превратилась в настоящий праздник. В столичном парке Горького их ждал нарядный, ярко украшенный флажками прогулочный катер, который прокатил их по Свислочи.

Организаторами данной благотворительной акции стал клуб "Ротаракт" — общественное, добровольно-благотворительное объединение, в состав которого входят молодые люди от 18 до 30 лет. В марте "Ротаракт" устроил Праздник весны для детей хосписа: было организовано цирковое представление, сладкий стол для всех малышей, получивших в тот день игрушки в подарок.

В реставрации прогулочного катера участвовали члены клуба и работники парка. По словам директора "Ротаракта" **Дениса Шуклина**, в общей сложности на реставрацию корабля потрачено около 450 тысяч рублей.

Ольга БЕЛАЯ.

ЗАПРАШЭННЕ

На сцэне — сямейныя музычныя ансамблі

Канец сёлетняга канцэртнага сезона супаў з пачаткам новага цыкла канцэртаў, распачатага канцэртна-лекцыйным бюро Беларускай дзяржаўнай філармоніі. Цыкл называецца "Сямейныя музычныя ансамблі". У ім прымуць удзел прадстаўнікі вядомых на Беларусі музычных дынастый.

Першы канцэрт будучага цыкла прымеркаваны да 10-годдзя Міжнароднага года сям'і і адбудзецца ***14 мая*** ў зале камернай музыкі Белдзяржфілармоніі *(касцёл св.Роха)*.

У 1-м аддзяленні выступіць уладальніца прыгожага драматычнага сапрана, салістка Белдзяржфілармоніі **Таццяна Громава** і яе сын — дыпламант міжнароднага і лаўрэат нацыянальнага конкурсаў, саліст беларускай оперы **Уладзімір Громаў** (барытон). У іх выкананні прагучаць рамансы і дуэты С.Рахманінава, Б.Шарамецьева, А.Варламава і іншых кампазітараў. Акампаніраваць Громавым будзе вядомая беларуская піяністка **Таццяна Старчанка.**

У другім аддзяленні гэтага незвычайнага канцэрта прымуць удзел бацька і дачка **Марэцкія.** Лаўрэат міжнародных конкурсаў, саліст Белдзяржфілармоніі **Мікалай Марэцкі** — бліскучы дамрыст-віртуоз, член Еўрапейскай гітарна-мандалiннай асацыяцыі (Гамбург), а таксама старшыня асацыяцыі дамрыстаў і мандалiністаў Беларусі. Яго дачка Кацярына пакуль што вучыцца на фартэпіянным аддзяленні Беларускай акадэміі музыкі, але ўжо некалькі сезонаў запар канцэртуе разам з бацькам у якасці яго акампаніятара.

У выкананні Мікалая і Кацярыны Марэцкіх прагучаць віртуозныя творы І.Баха, С.Пракоф'ева, Н.Паганіні.

Правядзе вечарыну вядомая музыказнаўца **Ала Агаркава.**

Ул.інф.



На здымку: *Мікалай і Кацярына Марэцкія.*

Романтический детектив от «J_морс»

Группа "J_морс" на днях сняла клип на песню "Альбион" из последнего альбома "Montevideo" — одного из главных лидеров продаж среди белорусских релизов весны этого года. Отметить это музыканты решили не совсем обычным концертом.

Клип снимали на квартире у **Алексея Ероховца,** экс-продюсера группы "Neo" и большого друга "J_морс". Впустить музыкантов к себе ему было не так просто.

"В прошлый раз, когда он доверял мне свои покои, я ему двери выбил и плиту сжег. Мы там вечеринку устраивали. Было это года четыре назад, — рассказал лидер "J_морс" **Владимир Пугач**. — *Так что сейчас он с опаской отнесся к процессу. Его не успокаивало то, что со мной пришли солидные люди, с камерами, с приборчиками-рельсами. А потом он, в общем-то, притих и даже генерировал какие-то идеи".*

Продюсером клипа стала **Елена Бартлова**, которая нашла режиссера **Андрея Лескина.** Вместе они придумали сюжет романтического детектива, который и станет клипом "Альбион". Завязка такова: девушка собирается лететь в Англию к своему любимому. Она собирает вещи, выходит на улицу, но тут проезжающий мимо таинственный мотоциклист крадет сумочку с документами и деньгами. Говорят, закончится все хорошо...

Премьера клипа состоится в двадцатых числах мая на "Первом музыкальном" и в течение нескольких недель его можно будет увидеть только на этом канале. Так что следите за анонсами.

А пока группа "J_морс" решила отпраздновать удачные съемки нового клипа не совсем обычным (акустическим) концертом, который пройдет ***12 мая*** в клубе "Ворон" (ДК МТЗ). Именно там поклонники смогут услышать первое публичное исполнение акустических версий песен "Web-дизайн", "Монтевидео" и даже "Альбион", которые в записи буквально напичканы электроникой.

Обладатели билетов по 12 тысяч получат в подарок альбом "Montevideo" с автографами музыкантов. Количество таких билетов строго ограничено!

Среда, 12 мая

БТ

07.00, 08.00, 09.00, 10.00, 11.00, 12,00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00 Новости.
07.05, 07.35, 08.10, 08.35 "Доброе утро, Беларусь!".
07.30, 08.30, 19.55 "Деловая жизнь".
09.15, 19.15 "Сага о Форсайтах". Сериал.
10.05, 20.00 "Семнадцать мгновений весны". Сериал.
11.05, 17.30 "Богатые и знаменитые". Сериал.
12.10, 16.45 "Моя страна".
12.30 "Квартет Гварнери". Детектив.
14.15 "На перекрестках Европы".
15.10 "Самые, самые, самые". Сериал.
16.05 "5x5".
17.15 "Земельный вопрос".
18.30 "Кстати".
21.00 "Панорама".
21.45 Конкурс песни "Евровидение-2004". Полуфинал. Прямая трансляция из Турции.
00.20 "Дорога к Евро-2004".

ОНТ

07.00, 07.30, 08.00, 08.30, 09.00, 18.00, 20.30, 23.15 "Наши новости".
07.05 "Наше утро".
09.05, 19.05 "Клон". Сериал.
09.55, 18.10 "Дом". Реалити-шоу.
10.40 "Не только о футболе".
11.00, 23.30 "Фабрика звезд-4".
11.25 "Дисней-клуб".
14.55 "Город женщин".
15.55 "Берег мечты". Сериал.
16.50 "Большая стирка" с Андреем Малаховым".
20.00 "Время".
21.05 "Другая жизнь". Сериал.
22.10 "Улицы разбитых фонарей". Сериал.
23.30 "Фабрика звезд-4".

РОССИЯ

07.45, 19.55 "Демон полдня". Сериал.
08.50 "Короткое замыкание".
09.45, 23.15 "Вести. Дежурная часть".
10.00, 16.00, 19.00 "Вести".
10.30, 19.30, 22.15 "Местное время. Вести — Москва".
10.50 "Что хочет женщина".
11.50, 21.00 "Против течения". Сериал.
16.10 "Госпожа победа". Сериал.
17.05 "Комиссар Рекс". Сериал.
18.00 "Городок".
19.50 "Спокойной ночи, малыши!".
22.00 "Вести +".
22.20 "Исторические хроники" с Николаем Сванидзе". "1921 г. Тухачевский".
23.30 "Цветы от победителей". Боевик.

ЛАД

06.30 EURONEWS.
08.00, 14.00, 20.00 Новости.
08.10 "Площадь искусств".
08.35 "Мама, я живой". Худ.фильм.
09.50 "Сад мечты".
10.05, 18.15 "Между нами, женщинами". Тележурнал.
10.40, 21.15 "Грешная Анхелика". Сериал.
11.30, 13.15 "Обычный необычный день".
12.00 "Мама Ануш". Комедия.
13.45 "Киту-домовой". Мультфильм.
14.10 "Мультиклуб".
15.05 "Команда "SOS". Сериал.
15.30 "Не зевай!".
15.40 "Бум". Тележурнал для школьников.
16.10 "Алхимия слова".
16.15 "Анатолий и Филипп Щитовы. Икона в дереве". Док.фильм.
16.25 "Росчерк времени".
16.40 "Война под крышами". Худ.фильм.
20.15 "Колыбельная".
20.30 "Дела семейные".
22.05 Плавание. Чемпионат Европы. Видеообзор.

НТВ

09.00, 11.00, 15.00, 18.00, 21.00 "Сегодня".
09.25 "Кулинарный поединок".
10.20 "Страна советов".
14.35 "Принцип "домино". Ток-шоу.
16.30 "Дикий мир: борьба за выживание". "Дом для гиппопотама".
17.35 "Протокол".
18.40 "Анализируй это". Комедия.
21.30 "Театр имени СССР".
21.00 "Страна и мир".
21.35 "Красная стрела".
21.45 "Детектив Раш". Сериал.

СТВ+RenTV

06.15, 18.00 "Минщина. Люди, события, факты".
06.25, 15.40 "Пауэр Рейнджерс, или Могучие рейнджеры в космосе". Телесериал.
06.50 "Наш друг Пишичитай" №1, 2, 3. Мультфильмы.
07.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.45 "24 часа".
07.50, 20.00 "СТВ-спорт".
08.05, 20.15 "Минск и минчане".
08.15, 23.05 "Технология".
08.25, 20.40 "Автопанорама".
08.45 "Закон и криминал".
09.00 "Беспокойный свидетель". Триллер.
10.40 "У цішы празрыстай цуд сустрэць магчыма". Видеофильм.
10.55 "Черный лев". Док.фильм.
11.30 "Горячий лед".
12.00 "Час суда".
13.00 "Дикая планета". "Новые заповедники". Док.фильм.
13.50, 18.30 "Инструктор". Сериал.
14.50 "Мятежный дух". Сериал.
16.00 "Веселые баксы".
16.15 "Тема дня".
16.50 "Игровой рефлекс".
17.00 "Медики". Сериал.
18.15 "Здравствуйте, доктор!".
20.25 "Добрый вечер, малыш...".
20.55 "Дядя Адольф по прозвищу "Фюрер". Комедия.
23.15 "Проект "Отражение".
00.00 "Секретные материалы". Сериал.
00.45 "Новости СНГ".

8-Й КАНАЛ

17.30 "Мультпарад" от "Бюргера".
17.45 "Опасные гастроли". Худ.фильм.
19.25 "К-видео". "Топ-8".
19.30 "Вечный зов". Сериал.
20.45 "Вечарніца".
21.00 "Атомик Филмз" и "К-видео" представляют...
21.05 "Народ против Ларри Флинта". Драма.

ТВ ЦЕНТР

04.45, 06.30 "Настроение".
07.35 "Газетный дождь".
07.45 "Жестокость". Драма.
09.25 "Русский космос". Спецрепортаж.
09.40 "Телемагазин".
10.00, 13.00, 21.00 "События. Время московское".
10.15 "Дата".
11.10 "Отдел "X".
11.50 "Квадратные метры".
12.05, 23.00 "Петровка, 38".
12.25 "Деловая Москва".
13.15 "Инспектор Кресс". Сериал.
14.30 ""Мода non-stop".
15.00 "Регионы: прямая речь".
15.30 "Ступеньки".
16.00 "Уголовная полиция". Сериал.
17.15 "Русский век".
18.00 "Страсти по Саломее". Сериал.
18.50 "Пять минут деловой Москвы".
18.55 "Убежище". Боевик.
21.40 "Версты". "Платная или бесплатная медицина — что лучше?"
22.30 "Времечко".
23.20 "25-й час. События. Время московское".
23.45 "Музыкальный серпантин".
00.00 "По закону". Худ.фильм.
01.00 "Синий троллейбус".

EUROSPORT

09.30 Экстремальный спорт. "Молодежная зона".
10.00, 12.00, 12.30, 18.30, 21.45, 22.15 Плавание. Чемпионат Европы в Испании.
13.30 Мультиспорт. "Всякая всячина".
14.00 Теннис. Турнир WTA в Италии.
16.30 Велогонки. Тур Италии.
20.00 Футбол. Чемпионат Европы среди юниоров во Франции.
23.00 Новости "Евроспорта".
23.15 Мультиспорт по средам.
23.30 Конный спорт. Кубок Наций "Самсунг" во Франции.
00.30 Гольф. Европейский тур в Великобритании.
01.00 Гольф. Турнир PGA в США.
02.00 Футбол. История чемпионата Европы.

Адрас рэдакцыі:
220030, Мінск, вул.Энгельса, 34а.
Прыёмная: тэл./факс (017) 206-68-71.
Тэл./факс рэкламнага аддзела: 206-69-04, 206-69-06.
E-mail: nv@promedia.by
http://nv.promedia.by

Індэкс 63222.

Заснавальнік і галоўны рэдактар Іосіф СЯРЭДЗІЧ

Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №246 ад 10 кастрычніка 1996 г. (пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі №224 ад 6 сакавіка 2000 г.). Нумар газеты аддрукаваны з дыяпазітываў заказчыка на ААТ «Красная звезда», 220073, г.Мінск, 1-ы Загарадны завулак, 3. Падпісаны ў друк у 15.00. Аб'ём 2 друк. аркушы. Тыраж: 27 500 экз. Заказ № 644.